ПАДПІСНОЙ ЛІСТ
(з даплатай)
на „Зьвязда“
На 1 мес. . . . — 80 к.
3 мес. . . . 2 р. 60 к.
6 мес. . . . 5 р. —
12 мес. . . . 9 р. 75 к.
Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „Зьвязда“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-61.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідкі. Зьвыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбавкі.

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

НЯДЗЕЛЯ, 18 мая 1930 г.
№ 114 (3712)
Год выданьня—XIV.
РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Эпл. Москва, Библиотека ВСНХ СССР Ст. Сьн /Зв. I/

Бальшавіцкае прывітаньне Менскай акруговай партканфэрэнцыі

Да VIII акруговай канфэрэнцыі Менскай арганізацыі КП(б)Б

Менская акруговая партыйная арганізацыя прышла да VIII канфэрэнцыі і ідзе да XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б) колькасна і якасна ўзрослай. Ідэйна згуртаваный вакол генэральнай лініі партыі і яе ленінскага ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

Менская арганізацыя загартоўвалася ў рашучай барацьбе з галоўнай небясьпекай на даным этапе — правым ухілам, з праявамі праваапартуністычнай практыкі, у барацьбе за канчатковую ліквідацыю рэштак контр-рэвалюцыйнага трацкізму, з «левымі» загібамі, скажэньнямі партыйнай лініі ў калгасным будаўніцтве, з прымірэнчымі адносінамі да ўсялякіх ухілаў.

Менская арганізацыя загартоўвалася ў рашучай барацьбе з нацыянал-апартунізмам, беларускім нацыянал-дэмакратызмам, які на справе зьяўляецца агентурай фашысцкай контр-рэвалюцыі, у барацьбе з рэшткамі бундаўскай ідэалёгіі і са спробамі ідэалізацыі Бунду, у барацьбе з шавінізмам усіх колераў.

Арганізацыя выхоўвалася ў барацьбе за выкарчоўваньне капіталістычных элемэнтаў у краіне, у барацьбе за ліквідацыю кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі, за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Правільная лінія партыі, непахіснасьць, цьвёрдасьць і пасьлядоўнасьць Менскай партарганізацыі ў барацьбе за канчатковую перамогу справы рабочае клясы забясьпечыла (пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б) максымальныя посьпехі ў сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі.

Вялавая прадукцыя рэспубліканскай прамысловасьці ў 1928-29 г. павялічылася на 46,4 проц. За першае паўгодзьдзе 1929-30 г. агульная прадукцыя вырасла на 93,3 проц. За першае паўгодзьдзе 1929-30 г. мясцовая прамысловасьць дала рост на 157 проц.

Рост прадукцыі зьявіўся вынікам вялізарнага працоўнага ўздыму рабочых мас, які выразіўся ў сацыялістычным спаборніцтве, ударным руху, няўхільнага павялічэньня капітальных укладаньняў, тэхнічнага пераабсталяваньня прамысловасьці, росту рабочай сілы, пераводу 36 проц. рабочых, занятых у прамысловасьці акругі, на 7-гадзінны працоўны дзень, пераводу 59,6 проц. рабочых на бесьперапынны тыдзень і г. д.

Значныя посьпехі ў галіне ўзьнясьцьпрадукцыйнасьці працы спрылялі росту прадукцыі прамысловасьці. Гаворачы аб нашых бясспрэчных дасягненьнях, мы лічым бальшавіцкім абавязкам з усёй рашучасьцю спыніцца на значных недахопах, моўшых месца за справаздачны час. Партыя бальшавікоў моцная тым, што яна своячасова, шляхам самай шырокай самакрытыкі, пры актыўным удзеле працоўных мас, выяўляе слабыя месцы ў асобных зьвеньнях работы і мабілізуе ўвагу партыйных мас і рабочае клясы на перамаганьне перашкод, якія стаяць на шляху сацыялістычнага будаўніцтва.

Сьледуючы гэтым бальшавіцкім прынцыпам, мы з усёй рашучасьцю падкрэсьліваем недавыкананьне прамфінпляну. За першае паўгодзьдзе 29-30 г. рэспубліканская прамысловасьць выканала прамфінплян на 95,6 проц. Партыйныя ячэйкі, прафсаюзныя арганізацыі і гаспадарчыя органы ня здолелі ў патрэбнай ступені мабілізаваць рабочых мас на барацьбу за прамфінплян, за ўзмацненьне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарнага руху, за правядзеньне дзіннаначальня. Гэтым у значнай ступені тлумачыцца прарыў першага кварталу і недавыкананьне прамфінпляну за першае паўгодзьдзе. Колькасныя паказальнікі выкананьня прамфінпляну часта адстаюць ад якасных. На радзе прадпрыемстваў пагоршылася якасьць прадукцыі. Мае месца няпоўнае выкананьне дырэктыў аб зьніжэньні сабекошту, слабая мабілізацыя ўнутраных рэзэрваў, невыстарчальная падрыхтоўка кваліфікаваных рабочых сілы і г. д.

Менская партыйная арганізацыя мае пэўныя дасягненьні ў калгасным будаўніцтве, галоўным чынам па лініі колькасных паказальнікаў і абагульненьня рабочай і прадукцыйнай скаціны. Але было-б вялікім палітычным злачынствам не падкрэсьліць, што ў практычнай рабоце па калектывізацыі быў дапушчан рад памылак, перагібаў і скрыўленьняў партыйнай лініі ў адносінах да серадняка як раённыя арганізацыямі, так і акруговым кіраўніцтвам.

Гэтыя скажэньні партыйнай лініі выявіліся ў падмене ленінскага прынцыпу добраахвотнасьці калгаснага руху адміністраваньнем, у ігнараваньні ленінскага прынцыпу ва заснаваньні саюзу з серадняком, ва ўжываньні мэтадаў прымусу адносна серадняка, у асобных фактах раскулачваньня сераднякоў, у ігнараваньні таго, што асноўным зьвяном на даным этапе зьяўляецца с.-г. арцель, у імкненьні абагуліць дробную жывёлу, птушак і г. д., у ігнараваньні работы сярод батрацка-бядняцкіх мас, у правядзеньні раскулачваньня незалежна ад суцэльнай калектывізацыі, у асобных фактах раскулачваньня ў мястэчках саматужнікаў і дробных гандляроў і г. д.

У некаторых раёнах мела месца сьвядомае замаскаванае супраціўленьне ажыцьцяўленьню дырэктыў партыі аб калгасным будаўніцтве. АК КП(б)Б хаця і рэагаваў на скрыўленьні партыйнай лініі ў калектывізацыі, у ліквідацыі кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі і сваімі пастановамі палярызаваў партарганізацыю супроць адміністраваньня ў калгасным будаўніцтве, супроць падмены сыстэматычнай і глыбокай работы па калектывізацыі адміністрацыйным раскулачваньнем, супроць правядзеньня раскулачваньня без палярызацыі шырокай падрыхтоўчай работы сярод бядняцка-серадняцкіх мас і г. д.,—але ў працэсе кіраўніцтва калектывізацыяй сельскай гаспадаркі і ліквідацыяй кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, — дапусьціў наступныя памылкі:

1) Вызначыў процант калектывізацыі для асобных раёнаў.

2) Вызначыў два раёны суцэльнай калектывізацыі без выстарчальнага ўліку эканамічных магчымасьцяй гэтых раёнаў.

3) Прыняў выклік Мазырскай партыйнай арганізацыі на сацыялістычнае спаборніцтва па колькасных паказальніках калектывізацыі.

4) Не даволі рашуча і своячасова рэагаваў на скрыўленьні лініі партыі і памылкі, якія дапускаліся асобнымі работнікамі і арганізацыямі ў калгасным будаўніцтве, у выніку чаго гэтыя памылкі часта яшчэ больш паглыбляліся нізавымі арганізацыямі.

5) Акругком ня вёў рашучай барацьбы з асобнымі памылкамі, дапушчанымі нашымі цэнтральнымі газэтамі, якія адначасова зьяўляюцца і органамі Менскага АК КП(б)Б.

6) Не асудзіў і не скасаваў пастаноў асобных райкомаў аб правядзеньні суцэльнай калектывізацыі да пачатку веснавой сяўбы, што 7-мы аб'яднаны пленум АК і АКК КП(б)Б з усёй бальшавіцкай рашучасьцю прызнаў, асудзіў і скасаваў свае пастановы, як неадпавядаючыя лініі партыі ў пытаньнях калгаснага будаўніцтва.

Няма патрэбнага перапому ў рабоце з батрацтвам і беднатой з боку большасьці ячэек. Гэта павінна быць рашуча асуджана, як адно з самых шкодных праяўленьняў праваапартуністычнага ухілу на практыцы.

Прафсэкцыянальныя саюзы Меншчыны за справаздачны час актыўна працавалі над перабудовай сваёй работы ў адпаведнасьці з пёзунгам «тварам да вытворчасьці». Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі прафсаюзы здолелі арганізаваць актыўнасьць рабочых мас на выкананьне прамфінпляну. Прафсаюзы правялі значную работу па ўдзеле ў калгасным будаўніцтве. Але, побач з гэтым, нельга прайсьці міма раду буйнейшых недахопаў у рабоце прафсаюзаў.

Перабудова прафсаюзаў на новыя формы і мэтады работы ідзе надзвычай марудным тэмпам. Да гэтага часу яшчэ няма пералому. Маюць месца значныя недахопы ў сацспаборніцтве, рабоце вытворчых брыгад і г. д. (выпадкі інжэнэрнага ўдарніцтва, праявы кампанейшчыны і парадняцтва, пагоні за колькаснымі паказальнікамі). Невыстарчальна разгорнута спаборніцтва сярод інжынэрна-тэхнічных сіл. Масавая культурна-палітычная работа прафсаюзаў яшчэ не адпавядае задачам сацыялістычнага будаўніцтва.

На даным этапе сацыялістычнай рэканструкцыі ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, будаўніцтва пралетарскай культуры, праблема падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў набывае вылучна важнае значэньне. За справаздачны пэрыяд прароблена вялізарная праца па выпучэньні новых кадраў з рабочых, батрацтва і бядняцка-серадняцкіх мас. Аднак, на гэтым вучастку маюць месца сур'ёзныя недахопы (невыстарчальнае кіраўніцтва работай выпучэнцаў, слабая дапамога ім у іх рабоце і г. д.).

Работа гарадзкіх саветаў была накіравана на выкананьне асноўных задач сацыялістычнага будаўніцтва. Перавыбары сельсаветаў зьявіліся праверкай работы партарганізацый у справе кіраўніцтва саветамі. Папітычным вынікам перавыбараў зьяўляюцца замацаваньне кіраўнічай ролі пралетарыяту ў саветах, узмацненьне саюзу рабочае клясы і батрацка-бядняцкіх мас з серадняком, павялічэньне колькасьці рабочых і беднаты ў складзе саветаў.

Пры правільнай у асноўным лініі цэнтральных газэт імі былі дапушчаны памылкі, якія выявіліся ў арыентацыі арганізацыі на пагоню за колькаснымі паказальнікамі, невыстарчальна выразнай лініі ў абагуленьні жывёлы, невыстарчальна выразнай пастаноўцы пытаньня аб арганізаванай сувязі ліквідацыі кулацтва, як клясы, з суцэльнай калектывізацыяй.

Характэрнай асаблівасьцю работы камсамольскай арганізацыі за мінулы пэрыяд зьяўляецца павялічэньне яе ўдзелу ў палітычным і гаспадарчым жыцьці краіны. Аднак, дасягненьні ў рабоце камсамолу не заўсёды пасьпявалі за ходам сацыялістычнага будаўніцтва. Аднэй з прычын недахопаў у рабоце камсамолу зьяўляецца ня зусім здавальняючая якасьць кіраўніцтва. Парткіраўніцтва камсамолам у радзе выпадкаў пастаўлена слаба.

Партыйная арганізацыя Меншчыны дабілася значных посьпехаў у сваёй рабоце таму, што на працягу ўсяго часу пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б рашуча змагалася з адхіленьнямі ад генінскай лініі партыі, з правым ухілам—галоўнай небясьпекай на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва, з «левымі» загібамі, скажэньнямі лініі партыі ў калгасным будаўніцтве, з нацыянал-апартунізмам, з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, з шавінізмамі ўсіх колераў, а таксама прымірэнчымі адносінамі да ўсялякіх ухілаў.

VIII акруговая партканфэрэнцыя, на аснове бальшавіцкай самакрытыкі падагуліць вынікі работы, дасягнутыя за паўтары гады работы партарганізацыі, выявіць найбольш слабыя зьвяньні ў нашай рабоце і вызначыць практычныя меры, якія-б забясьпечылі далейшае пасьпяховае сацыялістычнае будаўніцтва на аснове генэральнай лініі ленінскай партыі.

Трэба яшчэ больш мабілізаваць партарганізацыю на выкананьне задач, якія стаяць перад намі. Трэба разгортваць ініцыятыву рабочых мас, няўхільна ўзмацняць сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарны рух, забясьпечыць хутчэйшую перабудову партыйнай і прафсаюзнай работы, хутчэйшае ажыцьцяўленьне адзінаначальня. Мы павінны будзем на працягу другога паўгодзьдзя пакрыць недавыкананьне прамфінпляну за першае паўгодзьдзе і дабіцца перавыкананьня прамфінпляну.

Нам патрэбна накіраваць усе сілы на далейшае, неадкладнае і рашучае выпраўленьне скрыўленьняў партыйнай лініі ў калектывізацыі, перабудаваць работу так, каб па-бальшавіцку ў тэрмін скончыць веснавую сяўбу як у калгасах і саўгасах, так і ў індывідуальным сэктары, мабілізаваць усе сілы на барацьбу за далейшы ўздым сельскай гаспадаркі, за калгаснае будаўніцтва, за ліквідацыю кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі. Мы павінны рашуча ўзмацніць работу сярод батрацка-бядняцкіх мас, дабіцца арганізацыі батрацка-бядняцкіх груп ва ўсіх калгасах, дабіцца рашучага перапому ва ўцягненьні батракоў у калгасы.

Партыйная арганізацыя павінна з неадкладнай энэргіяй рашуча змагацца з усялякімі адхіленьнямі ад ленінскай лініі партыі ў нацыянальнай палітыцы, як з нацыянал-дэмакратызмам, так і з шавінізмам усіх колераў. Мы павінны ўзмацніць культурнае будаўніцтва і абслугоўваньне нацменшасьцяй на іх роднай мове. Наша галавая задача заключаецца ў тым, каб узмацніць тэмп беларусізацыі, дабіцца ўкараненьня беларускай мовы ў найшырэйшыя рабочыя масы. Узмацненьне беларусізацыі, узмацненьне інтэрнацыянальнага выхаваньня—адны з нашых асноўных задач.

Работа сярод працоўных жанчын павінна стаць аднэй з галоўных задач партарганізацыі. Патрэбна максымальна ўзмацніць работу сярод жанчын, палепшыць работу дэлегацкіх сходаў, узьнімаць палітычна-клясавае выхаваньне батрачак, бяднячак і сераднячак, мабілізаваць іх на барацьбу з клясавым ворагам — кулаком, за далейшую калектывізацыю вёскі.

Патрэбна будзе аддаць сур'ёзную ўвагу кіраўніцтву саветамі. Накіраваць увагу саветаў на выкананьне асноўных задач сацыялістычнага будаўніцтва. У кіраўніцтве работай прафсаюзаў трэба зьвярнуць большую ўвагу на перабудову работы прафсаюзаў у адпаведнасьці з тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва, трэба дабіцца, каб прафсаюзы перабудавалі сваю работу ў адпаведнасьці з задачамі барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Рашучае разгортваньне самакрытыкі і ўнутрыпартыйнай дэмакратыі застаецца актуальнейшай задачай партарганізацыі. Разгортваньне самакрытыкі і ўнутрыпартыйнай дэмакратыі зьяўляецца пепшым сродкам перабудовы нашых арганізацый у адпаведнасьці з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва, паляпшэньня мэтадаў кіраўніцтва масамі, пепшым сродкам барацьбы супроць апартуністычных хістаньняў і ўхілаў ад лініі партыі і з прымірэнцтвам да іх.

Далейшае ўцягненьне ў партыю перадавых рабочых ад варштату, с.-г. рабочых, батракоў, пепшых бяднякоў, калгасьнікаў, работніц, батрачак, бяднячак-калгасьніц—застаецца цэнтральнай задачай нашай партарганізацыі. Мы таксама павінны будзем значна ўзмацніць работу па падрыхтоўцы кадраў, па ўзмацненьні тэарэтычнай вучобы і г. д.

МЕНСКАЯ АКРУГОВАЯ ПАРТЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ І НАДАЛЕЙ ЗАСТАНЕЦЦА МАНАЛІТНАЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ І ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ЛЕНІНСКАГА ЦК УсеКП(б) І ЦК КП(б)Б ПАВЯДЗЕ ШЫРОКІЯ РАБОЧЫЯ І БАТРАЦКА-БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІЯ МАСЫ ДА НОВЫХ РАШУЧЫХ БОЕК ЗА КАНЧАТКОВУЮ ПЕРАМОГУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА.

Бюро АК КП(б)Б.

Лепшы падарунак партыйнаму зьезду—

пасьпяховае і своячасовае правядзеньне сяўбы

Калгас „Арэшкавічы“ да тэрміну засеяў яравы клін. Яго шэф-фабрыка „Акцябр“ перавыканала прамфінплян

Вытворчы ўздым калгасьнікаў замацаваць правільнай арганізацыяй працы

Два падарункі XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду Усе КП(б)

Калгас «Арэшкавічы», Пухавіцкага раёну, Менскай акругі і яго шэф — 2.000 рабочых Менскай швэйнай фабрыкі «Акцябр» у падарунак XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б) паказалі прыклад высокасьвядомых адносін да выкананьня важнейшых задач сацыялістычнай перабудовы краю.

Калгас «Арэшкавічы», 14 мая, па некалькі тыдняў раней тэрміну скончыў сяўбу, цалкам выканаўшы свой пасеўны плян.

Яго шэф—рабочыя швэйнай фабрыкі «Акцябр», выканаўшы свой прамфінплян за першае паўгодзьдзе на 103,27 проц., ня спыніліся на гэтых посьпехах і далі ў красавіку і першай дэкадзе мае 113 проц. выкананьня прамфінпляну.

Атрымаўшы ад калгасу «Арэшкавічы» тэлеграму аб датэрміновым скончэньні сяўбы, таварыства садзейнасьці калектывізацыі сельскае гаспадаркі пры ЦП саюзу швэйнікаў і рабочыя фабрыкі «Акцябр» зьвярнуліся да падшэфных калгасьнікаў са спэцыяльным прывітальным лістом, у якім яны,

Жанчына — член праўленьня калгасу і загадчык жывёлагадоўляй у калгасе «Ленінскі Шлях» (Клімаўшчына)

паведамляючы аб сваіх апошніх вытворчых посьпехах, пішуць:

— Датэрміновае скончэньне вамі сяўбы зьяўляецца вынікам калектыўнай працы. Ваш посьпех яскрава сьведчыць аб тым, што толькі шляхам зьнішчэньня старых межаў і калектывізацыі сельскае гаспадаркі вы можаце палепшыць сваё жыцьцё і добрабыт.

— Мы лічым, што зараз ваша галоўная задача — апрацаваць і засеяць пустуючыя вучасткі зямлі ў вашым сельсавеце, а таксама арганізаваць дапамогу бліжэйшым калгасам і індывідуальным бядняцкім і маламоцным серадняцкім гаспадаркам, якія адстаюць у сяўбе, ня маючы магчымасьці ўласнымі сіламі апрацаваць і засеяць сваё поле.

— Датэрміновае выкананьне вамі пасеўнага пляну і перавыкананьне намі прамфінпляну зьяўляецца найлепшым падарункам XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б). Гэтыя факты даюць нам гарантыю, што змычка рабочае клясы з працоўным сялянствам не паслабее і што пяцігодка будзе выканана ў чатыры гады.

ПАДАРУНАК РАЙПАРТКАНФЭРЭНЦЫІ

Калгас „Маяк сацыялізму“ дапамог калгасу „Шлях Леніна“

11-га мая калгас «Маяк сацыялізму» (Барысаўскі прыгарадны сельсавет) наладзіў нядзельнік дапамогі Глівінскаму калгасу «Шлях Леніна». Выехала 36 плугоў. Заралі 25 га, у тым ліку 5 га цаліны.

У гэты-ж дзень абодва калгасы заключылі паміж сабою ўмову аб сацспаборніцтве.

Галоўныя пункты умовы:

Скончэньне сяўбы не пазьней 30 мая, пашырэньне плошчы на 10 проц., падняцьце працдысцыпліны, дапамога сем'ям чырвонаармейцаў, удовам і бяднейшым гаспадаркам, якія пакуль што ня ўступілі ў калгас.

Абодва калгасы абязьцілі сабе ўдарнымі і зьвярнуліся да ўсіх калгасьнікаў Барысаўшчыны з прапановай пайсьці па іх прыкладу.

Ф. ВОЎК.

Нядбайнасьць ці злачынства?

ВОРША. (Наш кар.). Касьцяная мука вельмі патрэбная для Аршаншчыны як угнаеньне. У акругу яе завозіцца даволі значная колькасьць. Усё ўгнаеньне непасрэдна паступае ў раёны, транзытам. 11 гэтага мая ў Багушэўскі раён паступіла касьцяная мука ў колькасьці 17,5 тон. Вагон з гэтай мукой прыбыў са станцыі Красное. Калі на ст. Багушэўская агледзелі гэту муку, цык выявілася, што гэта не касьцяная мука, а проста нейкі ўгнаенны пыл, бо складаецца яна з непераробленых касьцей, цэлых рэбраў, і нагадвае рогага сьмяцьця. Даваць гэту «муку» сялянам для высеву на палі ні [illegible] нельга. Яе перш за ўсё трэба перамолаць. Такім чынам цэлы вагон «касьцяной мукі» застаецца ляжаць.

— Што гэта такое,— дзівяцца Багушэўцы,— злачынства ці нядбайнасьць. Трэба вінаватых прыцягнуць да адказнасьці.

У хвасьце індывідуальнага сэктару

Сяўба ў Каралінскім раёне—адным з самых паўднёвых раёнаў БССР—пачалася раней, чым у другіх раёнах Мазыршчыны. Падрыхтоўка да сяўбы прайшла добра. Своячасова былі вылучаны 130 работнікаў раёну для арганізацыі пробнага выезду калгасаў у поле.

Здавалася, добра. Арганізаваны пачатак сяўбы павінен быў-бы даць добрыя вынікі ў выкананьні пасеўнага пляну. На справе-ж—адваротнае.

45 калгасаў раёну на 12-га мая выканалі плян сяўбы толькі на 36,8 проц., у той час, як індывідуальны сэктар—на 45,4 проц. Такі марудны тэмп сяўбы ў калгасах трэба тлумачыць тым, што раённыя арганізацыі, якія здолелі арганізаваць пробны выезд у поле, не змаглі замацаваць уздыму калгасьнікаў для далейшай работы. Раённыя арганізацыі недаацанілі важнасьці арганізацыі работы ў калгасах—праца калгасьнікаў ідзе самацёкам. Сацыялістычнае спаборніцтва не арганізавана. Няма правіл унутранага распарадку. У выніку адсутнасьць працоўнай дысцыпліны і зьніжэньне прадукцыйнасьці працы.

Вось факт. Пры арганізацыі калгасу «Чырвоны Ельск» было 35 гаспадарак. Пасьля пробнага выезду ў поле ўступіла ліпчэ 93 гаспадарак. Цяпер калгас мае 78 рабочых коняй, 25 шт. валоў, 335 рабочых рук. Такога росту калгаса дабіўся дзякуючы [illegible] масавай работе партарганізацыі і [illegible] прыкладнай работе калгасьнікаў з [illegible] кіраўніцтва, дабіўшыся добрых колькасных паказальнікаў, не [illegible] належных мер за замацаваньня дасягнутых посьпехаў, і працу ў калгасах пачала кульгаць.

Каляндарнага пляну (нядзельнага) працы так і ня склалі. Працы унутранога распарадку не [illegible] калгасьнікі не разьбілі на брыгады па пэўных галінах. Ніхто [illegible] ведае, што ён заўтра павінен рабіць. [illegible] аплату ўстанавілі па 2 рублі [illegible] забыліся [illegible]. Пасьля гэтага ня дзівіцца, што калгасы адсталі ў выкананьні пасеўнага пляну і ад індывідуальнага сэктару. У той-жа час раённыя арганізацыі [illegible] робяць, што патрабуюць [illegible] сяўбы, нічога не робячы [illegible] для арганізацыі працы ў калгасах.

Брыгадзір «Зьвязды»
А. ШАФАРОНАК.

АПЭРАЦЫЙНЫЯ ЗВОДКІ З ГАСПАДАРЧАГА ФРОНТУ

Пад знакам пераломy

Лічбы выкананьня прамфінпляну фабрыкамі «ЧЫРВОНАЯ БЯРЭЗІНА» і «ПРАЛЕТАРСКАЯ ПЕРАМОГА» за ПЕРШУЮ ДЭКАДУ МАЯ гавораць аб тым, што ў асноўным фабрыкі працуюць пад знакам пераломy. «Чырвоная Бярэзіна» выканала праграму на 104,8 проц., фабрыка «Пралетарская Перамога»—на 115,5 проц., ватэрпасны цэх—на 121,6 проц.

Прадукцыйнасьць працы на «Чырвонай Бярэзіне» складае за дэкаду 1.528 скрынячак запалак на аднаго рабочага ў дзень, замест 1.545 паводле пляну.

АДСТАЕ ФАНЭРНЫ ЦЭХ, які выканаў вытворчую праграму толькі на 92,5 проц. (за першае паўгодзьдзе па фанэрным цэху праграма выканана на 83,44 проц.).

Але гэтыя лічбы, хоць і сьведчаць аб некаторым пераломе, НЕ ДАЮЦЬ ПАДСТАЎ ДЛЯ ЗАСПАКАЕНЬНЯ. Трэба мець на ўвазе, што «Чырвоная Бярэзіна» недавыканала вытворчае праграмы за першае паўгодзьдзе НА 6,6 ПРОЦ., а сучасныя тэмпы работы «Чырвонай Бярэзіны» нельга яшчэ лічыць здавальняючымі. Асабліва трэба памятаць аб тым, што прадукцыйнасьць працы за першае паўгодзьдзе на «Чырвонай Бярэзіне» ўзьнята толькі НА 3,7 ПРОЦ., замест 14 проц. і сабекошт зьніжаны НА 4,82 ПРОЦ., замест 12,5 проц. А за першую дэкаду мая прадукцыйнасьць працы не дасягнула пляновага заданьня.

Перавыкананьне «бумажных» паказальнікаў на фабрыцы «Пралетарская Перамога» тлумачыцца, галоўным чынам, тым, што ўся фабрыка працавала на ўнутраны рынак, між тым, як прамфінплян складзены з разьлікам часткова і на экспарт, выкананьне якога займае больш часу і працы.

На фабрыцы «Пралетарская Перамога» давядзеньне прамфінпляну да кожнага рабочага ЯШЧЭ НЯ СКОНЧАНА. Паказальнікі для кожнага вярштату у цэхах яшчэ ня вывешаны. Ударныя брыгады паміж сабою спаборніцтва не наладзілі.

Усе гэтыя недахопы павінны быць у бліжэйшым-жа часе зьнішчаны. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на работу фанэрнага цэху.

Брыгадзір «Зьвязды»—ШАЎКАВЕЦ.

Хлебазавод праграмы недавыканаў

МЕНСКІ ХЛЕБАЗАВОД У КРАСАВІКУ НЕДАВЫКАНАЎ СВАЁЙ ВЫТВОРЧАЙ ПРАГРАМЫ НА 1,23%: ЗАМЕСТ 15.970 ЦЭНТН. ХЛЕБАЗАВОД ВЫПРАЦАВАЎ 15.773 ЦЭНТН. ЗАВОД ТЛУМАЧЫЦЬ НЕДАВЫКАНАНЬНЕ ПРАГРАМЫ ТЫМ, ШТО «ЭЛЬВОД», З ПРЫЧЫНЫ РАМОНТУ ТУРБІНЫ, ЗА КРАСАВІК СПЫНІЎ ПАДАЧУ ЭЛЬКАТРАЭНЭРГІІ. ІННЫХ ПАКАЗАЛЬНІКАЎ ЗА КРАСАВІК КАНТОРА ЗАВОДУ ЯШЧЭ НЕ ПАДВЯЛА.

Харчовая прамысловасьць у красавіку

Красавік быў пераломным месяцам у попыце на дрожджы, што дало магчымасьць нашым дражджавым прадпрыемствам перавыканаць плянавае заданьне: замест 460 тон выпрацавана 479 тон. Па асобных прадпрыемствах малюнак наступны: «Чырвоная Зара» замест плянавага заданьня ў 225 тон выпрацавала 239 тон, «Вызваленая Праца» замест 140—147 тон і «Пралетары»—93 замест 95 тон.

Заводы па выпрацоўцы алею ў красавіку далі: завод імя Адзярыхо—162,6 тоны замест 155, «Зара»—210 тон замест 230 і завод імя Калініна—124 тоны замест 125.

АБ РАБОЦЕ СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЭРАЦЫІ

Пастанова ЦК Усе КП(б)

1. Барацьба партыі за сапраўднае паляпшэньне забесьпячэньня працоўных мас гораду і вёскі, за карэнную перабудову быту працоўных, за павышэньне ўзроўню рэальнай зарплаты рабочых, за здавальненьне новых патрэбнасьцяй, узьнікаючых у сувязі з калектывізацыяй мільённых сялянскіх гаспадарак, няхвацьма павялічэньне адказнасьць сыстэмы спажывецкай каапэрацыі за выкананьне ўскладзеных на яе вялізных гаспадарчых заданьняў, запраектаваных пяцігодкай і кантрольнымі лічбамі на 1929-30 год.

2. Аднак, ня гледзячы на значны рост каапэраваньня насельніцтва, паширэньне гандлёвай сеткі і сеткі грамадзкага харчаваньня і хлебапячэньня, павялічэньне гандлёвых абаротаў, якія даходзяць ужо да 12 мільярдаў рублёў раздробнага гандлю — арганізацыйныя мэтады і тэмпы работы спажывецкай каапэрацыі ўсё яшчэ адстаюць ад агульных тэмпаў савецкага будаўніцтва. Слабое правядзеньне важнейшых заданьняў і зьніжэньне цэн на тавары шырокага ўжытку, самацёк у рабоце, няўменьне гандляваць, абслугоўваць спажыўца, няўменьне манэўраваць таварнымі фондамі, слабая работа па арганізацыі прыгарадных гаспадарак, бюракратызацыя работы і вельмі слабое разгортваньне грамадзкасьці, адсутнасьць сапраўднага сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, слабасьць каапэрацыйных кадраў і засьмечанасьць апарату чужым элемэнтам, — усё гэта патрабуе ўзмоцненай увагі партыйных, прафсаюзных і савецкіх арганізацый да задач паляпшэньня ўсёй работы каапэрацыйнай сыстэмы.

3. У мэтах зьнішчэньня адзначаных недахопаў у рабоце спажывецкай каапэрацыі і поўнага ажыцьцяўленьня ўскладзеных на яе контрольнымі лічбамі заданьняў, ЦК УсеКП(б) лічыць неабходным:

а) абавязаць усе партыйныя арганізацыі ўзмацніць кіраўніцтва работай спажывецкай каапэрацыі, дабіцца рашучага пераломy ў яе рабоце, каб забясьпечыць выкананьне колькасных і якасных паказальнікаў заданага партыяй і ўрадам пляну; узмацніць камуністычную праслойку ва ўсіх зьвяньнях каапэрацыі; падняць партыйную і прафсаюзную грамадзкасьць на праверку і паляпшэньне работы і склад яе апарату, арганізуючы шырокае вылучэньне, мабілізуючы рабочую актыўнасьць, ужываючы пэрыядычныя формы масавага кантролю, у прыватнасьці шляхам арганізацыі і праверкі каапэрацыйнай работы рабочымі брыгадамі; усямерна садзейнічаць чыстцы каапэрацыйнага апарату, скарыстоўваючы практыку чысткі для далейшага яго арганізацыйнага паляпшэньня;

б) абавязаць усе сельскія партыйныя арганізацыі сканцэнтраваць увагу батрацка-бядняцкага і серадняцкага актыву і калгасьнікаў на пытаньнях паляпшэньня і патаненьня сельскай сеткі спажывецкай каапэрацыі і выкананьня яе плянаў; абавязаць усе партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі зьвярнуць асаблівую ўвагу на правядзеньне ў жыцьцё сац. спаборніцтва ўнутры сыстэмы спажывецкай каапэрацыі паміж асобнымі саюзамі, прадпрыемствамі і г. д.;

в) прапанаваць Цэнтрасаюзу ў месячны тэрмін прадставіць у СПА свае канкрэтныя арганізацыйныя прапановы, якія забясьпечваюць выкананьне стачных перад каапэрацыяй новых задач, у прыватнасьці, у пытаньні аб пабудове гандлёвай сеткі і аб шляхох таваразапрасоўваньня. Адзначаны праект павінен асобна прадугледзець формы сувязі з мясцовымі каапэрацыйнымі саюзамі, якія (формы) забясьпечваюць своячасовую сыгналізацыю партыі і ўраду аб адбываючыхся працэсах і зьменах у таваразвароце;

г) прапанаваць Наркамгандлю СССР сумесна з ВСНГ СССР і Цэнтрасаюзам у двухмесячны тэрмін распрацаваць і ўнесьці ў СПА праект мерапрыемстваў у забесьпячэньні каапэрацыйнай сыстэмы на аснове заявак нізавой сеткі;

д) прапанаваць Цэнтрасаюзу дабіцца павышэньня рэнтабэльнасьці гандлёвай работы спажывецкай каапэрацыі з устанаўленьнем нармальнага прыбытку за кошт рацыяналізацыі, скарачэньня накладных і гандлёвых выдаткаў, барацьбы са стратамі і пакражамі, але не за кошт павялічэньня цэн на тавары;

е) прапанаваць Цэнтрасаюзу дабіцца ў бліжэйшы час карэннага пераломy ў справе выкананьня плянавых заданьняў па зьніжэньні сабекошту прадукцыі ў прамысловых прадпрыемствах спажывецкай каапэрацыі, прадставіўшы аб гэтым даклад у СНА не пазьней 15 чэрвеня г.г. Даручыць мясцовым партарганізацыям заслухаць спэцыяльныя даклады аб выкананьні пляну зьніжэньня сабекошту прадукцыі прамысловых прадпрыемстваў спажывецкай каапэрацыі. Прапанаваць «Правде», «Экономической жизни», Кооперативной жизни» і ўсяму мясцоваму друку арганізаваць шырокае асьвятленьне гэтага пытаньня.

4. Адначасова з гэтым ЦК УсеКП(б) лічыць неабходным:

а) прапанаваць Цэнтрабюро [illegible] вынаходніцтваў рэспубліканскім і абласным саюзам, а таксама [illegible] ЦРК [illegible] цьвёрдыя нормы рэштак [illegible] вядзеньнем іх да магазынаў і асобных прадпрыемстваў з такім разьлікам, каб была зьніжана супроць 1 студзеня на суму ня менш 250 млн. рублёў. Прапанаваць Цэнтрасаюзу мець пільны наструктурай па ўсёй каапэрацыйнай сыстэме;

б) забараніць усім арганізацыям браніраваць тавары без дазволу Наркамгандлю СССР. Пры тым бронь тавараў зьвыш пазычак, прадугледжаных у плане Цэнтрасаюзу, праводзіцца, пачынаючы з 3-га кварталу толькі па пастанове ў

Паўстанскі рух у Індыі

Сотні арыштаваных у Бамбэйскай правінцыі. Узмацненьне кампаніі грамадзянскае непаслухмянасьці

ЛЕНДАН, 17. У выніку новых спроб удзельнікаў кампаніі грамадзянскае непаслухмянасьці затрымаць палёты на салянныя склады, сёньня арыштаваны 224 чалавекі у Дхарсане і 200 чалавек у Шыродзе (Бамбэйская правінцыя). У Шыродзе групе добраахвотнікаў удалося прарвацца праз паліцэйскі кардон і касьць соль. Там яны былі захоплены паліцыяй. Адбылася сутычка, у выніку якой многія добраахвотнікі былі паранены. (ТАСС).

***

ЛЕНДАН У Алахабадзе адбылося насяджэньне выканаўчага камітэту ўсёіндыйскага нацыянальнага кангрэсу пад старшынствам Матылал Нэру. Выканком ухваліў рад рэзалюцый, разьлічаных на ўзмацненьне кампаніі грамадзянскае непаслухмянасьці. (ТАСС).

РОСТ САЛІДАРНАСЬЦІ ПАМІЖ ІНДЫЙЦАМІ І МУСУЛЬМАНАМІ

ЛЕНДАН, 17. «Дэйлі Геральд» (орган рабочай партыі) піша, што пазаўдзным для цяперашняга становішча ў Індыі зьяўляецца рост салідарнасьці паміж індыйцамі і мусульманамі. Правадыр мусульман Махамэд Алі выступіў з прапановамі аб заключэньні мусульманска-індыйскага пакту, праект якога будзе абгаворвацца на канфэрэнцыі ўсіх партый.

ПЕРЕД ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЗАБАСТОЎКАЙ ВА ЎСІХ АРАБСКІХ КРАЯХ

СТАМБУЛ, 15. На 16-га мая рыхтуецца генэральная забастоўка ва ўсіх арабскіх краёх (Эгіпэт, Палестына, Сірыя і г. д.), якая павінна пашырыцца і на іншыя магамэтанскія вобласьці. Лёзунгамі выступуць: «Поўная свабода арабскіх абласьцей», «Адмена дэклярацыі Бэльфура» і «Поўная палітычная амністыя». (ТАСС).

КАМУНІСТЫЧНАЕ ВОЙСКА Ў 40 МІЛЯХ АД ХАНЬКОЎ

ШАНХАЙ. Камуністычнымі атрадамі заняты гарады Сімагоу, Ханчуан (абодва ў 40 мілях ад Ханькоу). У баёх за гэтыя гарады ўрадавыя войскі панесьлі цяжкія паражэньні. У глыбіні правінцыі селянскі рух не заціхае. Імпэрыялістычная прэса раіць кітайскім генэралам «спыніць міжусобную вайну» і ўзяцца за сур'ёзнае зьнішчэньне камуністых, уплыў і сіла якіх непарыўна расьце. (ТАСС).

Рабочы рух у краёх капіталу

ЗАБАСТОЎКА ПРАТЭСТУ РАБОТНІКАЎ СУВЯЗІ Ў ПАРЫЖЫ

ПАРЫЖ, 15. Сёньня ў Парыжы была абвешчана ў знак пратэсту супроць адцяжваньня ўрадам пытаньня аб павышэньні зарплаты двухгадзінная забастоўка служачых тэлефону, тэлеграфу і радыё. Двухгадзінная забастоўка адбылася у радзе іншых буйных гарадоў. Сакст міністраў пастанавіў «прыняць [illegible] супроць наўтарэньня за[illegible] супроць слу[illegible] адмаўляюцца выконваць [illegible] нальнікаў».

ДАДНІ ЗЬЛЕТУ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ СПАРТОМЭНАЎ

13. У Пурстэнвальдэ (каля [illegible]) зараз адбываецца зьезд рэвалюцыйных рабочых спартыўных арганізацый. На зьездзе абмяркоўвалася [illegible]ньне аб надыходзячым зьлёце рэвалюцыйных спартэменаў у Эрфурце. Ужо зараз можна прадбачыць, што эрфурцкі зьезд зьбярэ ня менш 26.000 актыўных рэвалюцыйных спартэменаў.

ПАЖЫЦЬЦЕВАЯ КАТАРГА ПРАВАДЫРОМ ЯПОНСКАЙ КАМПАРТЫІ

ТОКІО, 14. Мукденскія ўлады затадалі суд надалей прысуджваць на пажыцьцёвую катаргу ўсіх камуністых, якія адыгрываюць кіраўнічую ролю ў рэвалюцыйным руху, а радавых удзельнікаў руху — да 10 год турэмнага зьняволеньня.

Паўстаньне сялян супроць фашызму ў Італіі

БАРЫКАДНЫЯ БОІ ПАМІЖ ПАЎСТАНЦАМІ І ВОЙСКАМІ

ПАРЫЖ, 17. Як падае «Юманітэ», у Апуліі (Італія) [illegible] сялянскае паўстаньне, [illegible] цяжкім эканамічным крызісам і непасільнымі падаткамі. Прыбыўшы для задушэньня паўстаньня атрад карабінэраў вымушаны быў адступіць пад націскам сялянскай масы, узброенай [illegible]камі і вілам. Карабінэры вымушаны былі зьбаракадавацца ў казармах. Мясцовая фашысцкая паліцыя, радавыя [illegible] якой складаюцца з сялян, дапучыліся [illegible] паўстанцаў, якія атакавалі і спалілі памяшканьне «Фашыо» (мясцовая арганізацыя фашысцкай партыі) і рад будынкаў, у тым ліку будынак пад [illegible]атковага аддзяленьня фашысцкага с.-г. аб'яднаньня. Паўстаўшымі была зрушана [illegible]вана тэлеграфная і тэлефонная сувязь. З прычыны гэтага толькі вечарам з [illegible] ніжэйшага порту Таранто моглі быць [illegible]накіраваны на месца паўстаньня грузавікі з маранкамі. У працягу усёй ночы паміж войскам і паўстаўшымі была жорсткая перастрэлка. У выніку бою, [illegible] паводле няпоўных папярэдніх падлікаў, 70 чал. забіта і некалькі сот паранена. 300 сялян арыштавана. У прыняволенных стан аблоўчых раёнах абвешчаны [illegible].

Паход прадпрыемцаў супроць рабочае клясы ў Нямеччыне

УЗМАЦНЕНЬНЕ РЭПРЭСІЙ СУПРОЦЬ КАМПАРТЫІ

БЭРЛІН, 14. Наступленьне прадпрыемцаў на рабочую клясу Нямеччыны прымае ўсё больш шырокія разьмеры. Адбываюцца масавыя звальненьні рабочых транспарту, рудніў, мэталюргічнай прамысловасьці. Прадпрыемцы Саксонскай мэталюргічнай прамысловасьці патрабуюць зьніжэньня зарплаты кваліфікаванага рабочага з 86 пфэнігаў (кала 40 кап.) у гадзіну да 75 пфэнігаў.

На прадпрыемстве «Магдэбург і Вэркэр», у Гальлі, пачалася забастоўка ў адказ на спробу зьнізіць стаўкі зьдзельнічыкаў. На прадпрыемстве «Рэйн і Мулер», у Бэрліне, бастуюць сьлесары. Ад прадпрыемцаў не адстаюць і сацыял-фашысцкія прафбюракраты. Праўленьне саюзу будаўнічых работ у Хэмніцы дабілася судовае пастановы, якая забараняе 5 рабочым, прыхільнікам рэвалюцыйнай прафапазыцыі, наведваньне сходаў саюзу пад пагрозай трахнованага штрафу і зьняволеньня ў турме на тэрмін да 6 месяцаў. Ва ўсіх раёнах, дзе абвастраецца эканамічная барацьба, узмацняюцца рэпрэсіі супроць Нямецкай камуністычнай партыі. (ТАСС).

ВЫВУЧЭНЬНЕ ЛЕНІНІЗМУ Ў БРАЦКІХ КАМПАРТЫЯХ

Ленінская школа Нарвэскай кампартыі.
НА ЗДЫМКУ: Заняткі па вывучэньні гісторыі рабочага руху.

Жорсткая схватка паміж Англіяй і Францыяй у Жэнэве

БРЫЯН НЕЗАДАВОЛЕНЫ ПРАРЫВАМ АНТЫСАВЕЦКАГА ФРОНТУ

Як паведамляецца ўжо ў нашай прэсе, у Жэнэве (Швайцарыя) 15 мая адкрылася чарговая сэсія Рады Лігі Нацый. Афіцыйныя пасяджэньні, на якіх гаворацца прыгожыя словы аб міры і разбраеньні, зьяўляюцца толькі дымовай заслонай, якая скрывае новае надзвычайнае абвастрэньне паміж рознымі капіталістычнымі дзяржавамі. За кулісамі Рады Лігі Нацый ідзе вельмі жорсткая барацьба ня толькі паміж Францыяй і Італіяй, але і паміж Францыяй і Англіяй.

Новым повадам для сутычкі паміж Францыяй і Англіяй зьявілася пытаньне аб арганізацыі банку міжнародных разьлікаў (гэты банк будзе ведаць справай спагнаньня з Нямеччыны ваеннай кантрыбуцыі і разьмеркаваньня яе паміж краінамі - пераможцамі). Англія вельмі незадаволена тым, што кіруючыя пласты ў тым банку прадастаўлены амэрыканцам і французам, а таксама і тым, што банк будзе знаходзіцца ў Швайцарыі, а ня ў Лёндане. Ангельскія дэлегаты ў Жэнэве адкрыта заяўляюць, што яны будуць змагацца супроць абарачэньня банку міжнародных разьлікаў у зброю францускай палітыкі.

Пазыцыя Англіі выклікае мацнейшае раздражненьне ў Францыі. Француская буржуазная газэта «Матэн» («Утро») надрукавала артыкул з рэзкімі нападкамі на Англію. Газэта абвінавачвае Англію ў тым, што яна не жадае дзейнічаць разам з Францыяй супроць СССР.

«Мабыць,—піша газэта — хваляваньні ў ангельскіх калёніях навучаць ангельцаў розуму». У такім - жа духу выказваюцца і францускія дэлегаты ў Жэнэве. Перадаюць, што францускі міністар замежных спраў Брыян у час апошняга спатканьня з Гэндэрсонам выказаў незадаваленьне адносна таго, што Англія прарвала адзіны антысавецкі фронт, заключыўшы гандлёвую згоду з СССР.

АДКРЫУСЯ 4-ты ПЛЕНУМ УсеЦСПС

МАСКВА, 16. Адкрыўся 4-ы пленум УсеЦСПС.

З дакладам аб прамфінпляне за першае паўгодзьдзе выступіў намесьнік старшыні ВСНГ СССР т. Рухімовіч. У 1927-28 годзе прырост прамысловай прадукцыі складаў 25,2 проц., у 1928-29 годзе—24 проц., а ў 1929-30 годзе—31.3%, у будучым 1930-31 годзе мяркуецца прырост прадукцыі на 40-45%. Агульная сума валавой прадукцыі да канца пяцігодкі была вызначана ў 30 мільярдаў руб., на цэнах 1926-27 году. Мы ў наступным годзе будзем мець прадукцыю ў 26-27 мільярдаў руб. У параўнаньні з 1913 годам выпуск прамысловай прадукцыі за першае паўгодзьдзе складае 199%. У першым паўгодзьдзі новыя заводы далі 14% усёй прадукцыі, лік рабочых, занятых у прамысловасьці павялічыўся на 5% (250.000 чал.), зьвыш аднаго мільёну рабочых перайшло ў апошнія 6 месяцаў на бесьперапынны рабочы тыдзень.

Асноўныя затрудненьні ў выкананьні прамфінпляну прамысловасьці заключаюцца ў нястачы прамысловага сырцу і ў памяншэньні выпрацоўкі кожнага рабочага супроць вызначанага пляну. Сабекошт прадукцыі зьніжаны на 5,8% замест вызначаных плянам 11,5 проц. Для выкананьня заданьня сабекошт павінен быць зьніжаны ў другім паўгодзьдзі на 16-17%.

Зусім нездавальняючымі павінны быць прызнаны якасныя паказальнікі. Дрэнная якасьць прадукцыі б'е па рэальнай зарплаце рабочага, затрымлівае разьвіцьцё сельскае гаспадаркі, якая прад'яўляе попыт на добрую машыну. Усё гэта ставіць перад прамысловымі прадпрыемствамі патрэбу забясьпечыць ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК УсеКП(б) аб адзінаначальні, магчыма паўней скарыстаць творчую ініцыятыву рабочых мас. (ТАСС).

САВЕЦКІЯ ДЭЛЕГАТЫ НА МІЖНАРОДНЫ КАНГРЭС

ЛЕНІНГРАД, 15. На міжнародны кангрэс у Брусэлі Акадэмія Навук камандыруе акадэміка Іпацьцева, Курнакова і Чычыбабіна. (ТАСС).

АМЭРЫКАНСКІЯ ІНЖЫНЭРЫ—НА РАБОТУ Ў СССР

ЛЕНІНГРАД, 16. На параходзе «Ян Рудзутак» у Ленінград прыбылі 25 амэрыканскіх інжынэраў, якія пасылаюцца ў Сталінград для работы на Трактарабудзе. Большасьць інжынэраў працавала на прадпрыемствах Форда. (ТАСС).

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ ЗАГАДЗЯ на ЧЭРВЕНЬ і далейшыя м-цы на газэту „ЗЬВЯЗДА“

ПАМЯТАЙЦЕ, што ў ЧЭРВЕНІ м-цы ў „Зьвязьдзе“ будуць друкавацца НАЙБОЛЬШ ПОУНА ўсе матар'ялы XIII зьезду КП(б)Б

Аб перагібах і грубых скажэньнях партыйных дырэктыў у справе калектывізацыі па Аршанскай акрузе

Пастанова прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і калегіі НК—РСІ БССР ад 11 мая г.г.

Заслухаўшы даклад камісіі ЦКК НК-РСІ БССР па выяўленьні перагібаў і грубых скажэньняў партыйных дырэктыў у справе калектывізацыі па Аршанскай акрузе, прэзыдыум ЦКК КП(б)Б і калегія НК РСІ БССР, канстатуючы значную работу, якая была праведзена партыйнымі і савецкімі органамі Аршанскай акругі ў справе сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі за апошні час, што падкрэсьліваецца ростам калектывізаванае зямельнае плошчы (з 7 проц. у кастрычніку 1929 г. да 16 проц., на 20 красавіка 1930 г.),—адзначаюць, што ў той-жа час, у справе калектывізацыі быў дапушчан рад нецярпімых грубых парушэньняў партыйнай лініі, як:

1. Кампанейскі падыход да калектывізацыі, рад бюракратычных настаноў раду раённых кіруючых партыйных і савецкіх органаў, (у Горацкім Дубровенскім, Лядзянскім раёнах пастанавілі калектывізаваць сялянскія гаспадаркі да вясны 1930 г. па 100 проц.; Лядзянскі РК КП(б)Б пастанавіў калектывізаваць увесь раён за паўтара месяца, Горацкі РК КП(б)Б у канцы студзеня 1930 г. абвясьціў месячнік калектывізацыі) і замест разгортваньня самадзейнасьці бядняцка- серадняцкіх мас—націск на сялянства, голае адміністраваньне, пагоня за лічбамі і палітычнае гаспадарчае незамацаваньне арганізаваных калгасаў.

Недапушчальна грубыя паводзіны, запалоховаьне, ігнараваньне і адміністрацыйнае сваявольства да бядняцка-серадняцкіх мас у часе правядзеньня сходаў па калектывізацыі з боку асобных работнікаў, выпадкі гвалтоўнага абагуленьня насельня і жывёлы ў бядняцка-серадняцкіх гаспадарках ня толькі ў тых, якія знаходзяцца ў калгасах, але і ў тых гаспадарках, якія не ўвайшлі ў калгасы, устанаўленьне калгасамі незаконных збораў з сялянства (Горацкі раён), адсутнасьць падліку і пазнежнага скарыстаньня ў радзе калгасаў кулацкіх сродкаў вытворчасьці і інш. рэчаў, што стварыла ўмовы для пасобных выпадкаў разбазараньня гэтай маемасьці. Адначасова меў месца значны процант раскулачаньня серадняка.

Адным з буйнейшых недахопаў у рабоце Аршанскай арганізацыі—гэта адсутнасьць належнай работы па арганізацыі батрацка-бядняцкіх мас, асабліва сярод жанчын. Замест сыстэматычнай, штодзённай работы па замацаваньні груп беднаты, дэлегацкіх сходаў, замест арганізацыйна - гаспадарчай дапамогі беднаце, падыходзілі да выкананьня важнейшай задачы партыі павярхоўна, кампанейскі.

Усе гэтыя недапушчальныя зьявішчы ня спрылялі і, у значнай ступені, перашкаджалі здаровараму калектыўнаму руху бядняцка-серадняцкіх мас і паслужылі сродкам у руках клясавага ворага і, у першую чаргу,—кулацтва да падрыву калектывізацыі ў асобных раёнах.

2. Пасьля надрукаваньня артыкулу тав. Сталіна, пасьля пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб рашучай барацьбе з дапушчанымі перагібамі і грубымі парушэньнямі партыйнай лініі, аб выпраўленьні дапушчаных памылак у справе калектывізацыі, — акругком КП(б)Б ня ўлічыў палітычнага значэньня дапушчаных перагібаў і скажэньняў, невыстарчальна мабілізаваў партарганізацыю на рашучае і шпаркае выпраўленьне дапушчаных памылак, на барацьбу супроць перагібшчыкаў, з прычыны чаго і да гэтага часу ў партарганізацыі наглядаюцца паасобныя разважаньні наконт правільнасьці партыйных дырэктыў. Гэта не дало магчымасьці ажыцьцёвіць у належнай меры кіраўніцтва батрацка-бядняцкімі масамі і мабілізаваць іх актыўнасьць на барацьбу з перагібамі і скажэньнямі, што стварала ўмовы для далейшых перагібаў, асабліва пры зямляводах.

Нават на такія зьявішчы, як ганебнае выступленьне ў красавіку асобных партыйцаў на сялянскіх і партыйных сходах супроць дырэктыў партыі аб выпраўленьні памылак і барацьбе з перагібамі (Расьнянскі раён) — акругком КП(б)Б ніякіх канкрэтных мер ня прыняў, а сакратар акругкому на пісьмовую заяву аб гэтым сакратара РК КП(б)Б, абмежаваўся бюракратычнай рэзалюцыяй аб азнаямленьні з заявай двух членаў бюро (Хандогі і Мангусу), якія ў сваю чаргу на гэта не рэагавалі.

Такія зьявішчы з боку акругкому КП(б)Б ЦКК расцэньвае як прымірэнцтва да перагібаў і апартуністых.

3. Адзначаючы вялізарную стойкасьць і працоўны энтузіязм у існуючых калгасах бядняцка-серадняцкіх мас і рашучы адпор з іх боку актыўным кулацкім групам, якія выступаюць супроць калектывізацыі,—прапанаваць Аршанскаму АК КП(б)Б мабілізаваць усю партарганізацыю, савецкі апарат і грамадзкія арганізацыі на рашучую барацьбу з перагібамі і выпраўленьне дапушчаных, а ў асобных выпадках працягваемых перагібаў да бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Акругкому КП(б)Б паставіць перад партарганізацыяй, як важнейшую задачу, сыстэматычную работу сярод батрацка-бядняцкіх мас, палітычна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў і гаспадарча-вытворчую дапамогу бядняцка - серадняцкім гаспадаркам з тым, каб стварыць глебу да далейшага пашырэньня калектывізацыі.

4. Бюро акругкому КП(б)Б за ўсё вышэйадзначанае абвясьціць вымову.

Паказаць членам бюро т. т. Хандогі і Мангусу на абсалютна недапушчальны ўчынак аб перэгаваньні, праз пастаноўку на бюро, на ўчынкі партыйцаў, паданыя ў інфармацыі сакратара Расьнянскага райкому КП(б)Б.

Тав. Віляністовіча зьняць з пасады сакратара АК КП(б)Б.

5. Прэзыдыуму АВК за слабое кіраўніцтва РВК і сельсаветамі ў справе калектывізацыі, дапушчэньне значнага процанту раскулачаньня сераднякоў, нерашучасьць па савецкай лініі барацьбы з адміністрацыйным свавольствам і перагібамі і скажэньнямі ў справе калектывізацыі—абвясьціць вымову.

6. Хоць АКК-РСІ і прымала меры барацьбы з перагібамі, якія мелі месца, і скажэньнямі партыйнай лініі ў справе калектываізацыі, аднак, прэзыдыум ЦКК лічыць гэта невыстарчальным, на што і паказаць прэзыдыуму АКК і Калегіі РСІ.

7. Прыняць да ведама паведамленьне Аршанскага АК і АКК КП(б)Б аб тым, што ў сучасны момант сакратар Лядзянскага РК КП(б)Б тав. Байдакоў за бязьдзейнасьць па барацьбе са злоўжываньнямі і дапушчэньне грубага парушэньня партыйнай лініі ў справе калектывізацыі — прыцягнут да партадказнасьці і зьнят з работы, а старшыня РВК тав. Фэдараў, сакратар РВК тав. Касьцюковіч, заг. фінчасткай Янум і старшыня Лядзянскага спажывецкага таварыства Цэрайкоўскі таксама зьняты з работы і прыцягнуты да адказнасьці. Райінспэктар нарасьветы тав. Баўтуноў таксама прыцягнут да адказнасьці, а член РВК тав. Лазараў—за гвалтоўныя дзеяньні над сялянамі пры абагульваньні жывёлы—таксама адданы пад суд; што ў Дубровенскім раёне склад партыйнага і савецкага кіраўніцтва зьменен і вінаватыя прыцягнуты да адказнасьці як у партыйным, так і судовым парадку.

8. Прыняць да ведама паведамленьне камісіі, што партКіраўніцтва па Горацкім РК КП(б)Б у зьвязку з партканфэрэнцыяй, цалкам адноўлена. Даручыць Аршанскай АКК-РСІ прыцягнуць да партыйна-савецкай адказнасьці стары склад бюро РК КП(б)Б і прэзыдыум РВК.

Таксама прыняць да ведама, што праўленьне калгасу «Чырвоны Ударнік» аддана пад суд. Прапанаваць АК КП(б)Б зараз-жа зьняць з работы старшыню праўленьня гэтага калгасу тав. Маслоўскага і старшыню праўленьня калгасу «1-ае мая» тав. Шыціхава з аддачай апошняга за адміністраваньне і зьдзекі над сялянамі таксама пад суд.

9. Даручыць Аршанскай (АКК-РСІ прыцягнуць да партыйнай і савецкай адказнасьці старшыню Мсьціслаўскага РВК тав. Буянова, загадчыка райза тав. Шэвяльдзіна, агента крымвышуку тав. Туніса, сакратара парт'ячэйкі тав. Новікава, настаўніка тав. Шышаева, члена сельсавету тав. Рякусава, сакратара Хадосаўскага сельсавету т. Нікеева і старшыню калгасу Сацэлава (Мазалкоўскага сельсавету); па Расьнянскім раёне—Лядзеўскага, Шылянкова, Карнеева і Вародзіча, перадаўшы матар'ял на Буякова, Новікава, Шышаева, Ракусава і Нікеева судова-сьледчым органам.

Адзначаючы рад няправільных пастаноў і дзеяньняў з боку Аршанскага акркалгасаюзу і Лядзянскага, Дубровенскага агра-індустрыяльнага камбінату, скажаючых партыйныя дырэктывы, даручыць Аршанскай АКК-РСІ прыцягнуць праўленьні гэтых аранізацый да адказнасьці.

Аб выніках выкананьня гэтых даручэньняў АКК-РСІ праз месяц паведаміць прэзыдыум ЦКК КП(б)Б.

10. Даручыць Аршанскай ЦКК-РСІ праз два месяцы праверыць выкананьне ўсёй гэтай пастановы партыйнымі і савецкімі акруговымі і раённымі ўстановамі і далажыць прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б.

11. Гэту пастанову абвясьціць у друку.

Старшыня ЦКК КП(б)Б
Нарком РСІ БССР КАЛІНІН.

Пастанова Бюро ЦК КП(б)Б ад 16 мая г.г.

1. Згадзіцца з пастановай ЦКК КП(б)Б ад 11 мая 1930 г.

2. Адзначыць, што парткіраўніцтва Аршанскай акругі недастаткова прызнала свае памылкі ў зьвязку з калектывізацыяй і не прыняло неабходных мер для хуткага арыентаваньня арганізацыі па пытаньнях скажэньняў і перагібаў у справе калектывізацыі.

3. Зьняць тав. ВІЛЯНСТОВІЧА з пасады сакратара Аршанскага акругкому КП(б)Б, адклікаўшы яго ў распараджэньне ЦК КП(б)Б.

Кастрычніцкая партканфэрэнцыя

Спрэчкі па дакладу РК КП(б)Б

Па дакладу раённага камітэту партыі разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі.

Тав. Шасвіч заявіў, што раённы камітэт невыстарчальна кіраваў канапрацыйнымі ячэйкамі. Між тым, канапрацыйныя парт'ячэйкі аднаюць вялікую колькасьць камуністых.

Тав. Юркянец завастрыў увагу канфэрэнцыі на становішчы раённай арганізацыі ЛКСМБ. Ён адзначае, што ў рабоце камсамольскай арганізацыі мелі месца буйныя прарывы. Прамоўца падкрэсьліў, што партыйнае кіраўніцтва камсамольскімі ячэйкамі павінна быць узмоцнена.

Тав. Апарын гаварыў аб памылках РК КП(б)Б пры вырашэньні справы аб антысэміцкіх выступленьнях у вагонных майстэрнях.

Тав. Рыўкін гаварыў аб невыстарчальнай рабоце сярод вылучэнцаў. Вельмі часта вылучэнцы не атрымліваюць пікай дапамогі. Тав. Рыўкін адзначыў, што раённы камітэт прымае слабы ўдзел у чыстцы апарату.

У спрэчках выступалі таксама т. т. Славінскі, Гобэрман, Іваноў, Даніловіч, Барткевіч, Эстэркін, Пыжыкаў і г. д.

***

Учора канфэрэнцыя зацьвердзіла рэзалюцыю па дакладах АК і РК КП(б)Б.

Рэзалюцыя аб'яднанага пленуму Менскага АК і АКК КП(б)Б

(4—5 мая г. г.)

па справаздачы бюро акругкому КП(б)Б*)

Шырокаму тэмпу родная гаспадарка [illegible]лы разгортваньня [illegible]ва. Адзначаючы [illegible]ні ў разгортваньні [illegible]чаньня, ліквідацыі асабліва сярод работы беднаты школьнай [illegible]цыі вышэйшых і тэхнікумаў, — [illegible] баявой задачай у [illegible]веты павінна быць [illegible]не ў масавую пікетмэнтаў вытворчага [illegible]неньнем камуністы[illegible]ва. Неадкладнае [illegible]па далейшым пра[illegible]га навучаньня. [illegible]станьне ў справе [illegible]тва сродкаў пра[illegible] калгасаў, каапэрацыяй, павялічэньне [illegible]трактара, беднаты [illegible]ніць вясковы сяўгасаў. Зьвярнуць [illegible] палянышэньне сацыя[illegible] стаўпікаў, а таксама [illegible] перападрыхтоўку і [illegible]нізацыяй і рэарганізацыяй сельскай [illegible]родкай асьветы.

Адзначаючы, што [illegible] працы не адпавядзе[illegible]ня шырокіх пра[illegible]ньня іх неабходны[illegible]ялістычнага будаў[illegible] асьветная праца [illegible]на адстае ад задач [illegible]каструкцыі сельскай [illegible] пленум катэгарычна [illegible]нізацыям узмацніць [illegible] асьветнай і клюбнай [illegible]ся правядзеньня ге[illegible] адпавядзе[illegible]ськасьці з [illegible]га будаўніцтва.

Улічваючы, што [illegible] сацыялістычнай [illegible]ніцкіх тэмпаў індустрыялізацыі і калгаснага будаўніцтва, [illegible]тарскай культуры [illegible]ная клясавай барацьбы, [illegible]рыхтоўкі, перападрыхтоўкі, [illegible]чэньня кадраў на [illegible]тычнае значэньне, [illegible]мітэтам за справаздачы [illegible]роблена вялізарная [illegible]ны пагодных, не[illegible] партыі кадраў і [illegible]гушчы рабочых, батрацтва і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства, — пленум АК адзначае рад буйнейшых недахопаў у гэтай важнейшай працы партыйных арганізацый, а іменна не заўсёды зварачалася належная ўвага на якасьць вылучаных таварышоў, нездавальняючча пастаўлена кіраўніцтва працай выкананьня і дапамога ім у рабоце, адрасьць, неўстарчальнае вылучэньне кіруючых кадраў з ліку батрацка-бядняцкай масы вёскі. Таму пленум на неабходнасьць [illegible]ліквідацыі штодзённай працы ў справе выкананьня гэтай цэнтральнай задачы партыі, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на зьнішчэньне недахопаў.

Партарганізацыя павінна з неаслабнай энэргіяй і далей узмацняць кіруючыя кадры ва ўсіх галінах савецкай, партыйнай, прафэсыянальнай і гаспадарчай работы, вылучаючы рабочых з вытворчасьці на кіруючую работу, а ўсёй рашучасьцю замяняючы тых кіруючых работнікаў, якія ня здольны праводзіць правільную бальшавіцкую лінію, выяўляць хістаньні, нездольных перамагаць труднасьці і кіраваць масамі.

Для ажыцьцяўленьня задач на лініі сельскай гаспадаркі, неабходна ўзмацніць яшчэ больш працу ў галіне падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў, вылучэньня з батрацка - бядняцкіх груп у якасьці кіраўнікоў асобных калгасаў і саўгасаў і іх аб'яднаньняў. Актуальнейшае значэньне на гэтым этапе сацыялістычнай рэканструкцыі набывае праблема культурных кадраў у сувязі з задачамі разгортваньня культурнага будаўніцтва.

Прафэсыянальныя саюзы Меншчыны за справаздачны пэрыяд працавалі над ажыцьцяўленьнем важнейшай дырэктывы партыі аб перабудове ўсёй працы прафэсыянальных саюзаў «тварам да вытворчасьці».

Пленум адзначае, што прафэсыянальныя саюзы, пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, здолелі арганізаваць актыўнасьць рабочае клясы на выкананьне прамфінпляну,(на выкананьне лёзунгу пяцігодка—за чатыры гады, шляхам разгортваньня сацспаборніцтва на прадпрыемствах і яго вышэйшай формы —ударніцтва, перарастаючага ў вытворчыя камуны, калектывы, правядзеньня, над кіраўніцтвам партарганізацыі, ленінскага набору ўдарнікаў і зьвязанай з гэтым наборам растлумачальная праца аб неабходнасьці ліквідацыі прарываў у справе выкананьня прамфінпляну.

Прафэсыянальныя саюзы правялі значную працу ў арганізацыі калгаснага руху шляхам пасылкі ўдарных брыгад, мабілізацыі рабочых на сталую працу ў калгасах.

З палітычным уздымам праведзены перавыбары фабрычна - заводзкіх камітэтаў па саюзах мэталістых і паняровай вытворчасьці. Побач з адзначанымі дасягненьнямі пленум адзначае рад буйнейшых недахопаў у працы прафэсыянальных саюзаў. Перабудова прафэсыянальных саюзаў па новыя рэйкі працы ідзе надзвычай марудным тэмпам і да гэтага часу яшчэ пералому ў гэтай рабоце не дасягнута.

Ва ўдарным руху значна пашыраны зьявы ліквэ - ударніцтва, супроць чаго прафэсыянальныя саюзы яшчэ не мабілізавалі ў належнай ступені рабочых мас. Невыстарчальнае кіраўніцтва сацспаборніцтвам з боку вытворчых нарад. Рад ударных прадпрыемстваў, цэхаў аказаліся нездольнымі выканаць узятыя на сябе адказьнейшыя абавязкі.

Культурна - палітычная праца прафэсыянальных саюзаў яшчэ не адпавядае задачам сацыялістычнай рэканструкцыі і сучасным тэмпам індустрыялізацыі.

Пленум прапануе бюро ў кіраўніцтве працай прафэсыянальных саюзаў зьвярнуць большую ўвагу на хутчэйшую перабудову прафэсыянальнымі саюзамі сваёй працы ў адпавядасьці з тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва, накіраваўшы галоўную ўвагу саюзаў на выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну прамысловасьці акругі. Адначасова прафэсыянальныя саюзы павінны зьвярнуць увагу на якасныя паказальнікі ходу сацспаборніцтва і ўдарнага руху, на ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі аб правядзеньні адзіначальля ў сэнсе павышэньня адказнасьці кожнага з працаўнікоў у галіне сваёй працы, перабудовы культурна - палітычнай працы ў напрамку выхаваньня шырокіх рабочых мас на выкананьне асноўных задач, якія стаюць перад партыяй і прафэсыянальнымі саюзамі, па лініі індустрыялізацыі і калгаснага будаўніцтва.

Адзначае, што разгортваньне работы сярод нацыянальных меншасьцяй акругі праходзіць вельмі слаба. Асобныя РК і ячэйкі ня ўлічваюць важнасьці гэтай работы, а пад час ігнаруюць яе, што скарыстоўваюць клясавыя ворагі.

Пленум з усёй рашучасьцю патрабуе ад бюро АК, РК і ячэек КП(б)Б зьвярнуць большай увагі на работу сярод нацыянальных меншасьцяй, асабліва палякаў і местачковага яўрэйскага насельніцтва, разгортваючы культурна-масавую работу, арганізуючы беднату і серадняцтва вакол генэральнай лініі партыі, учэпваючы іх у сацыялістычнае будаўніцтва вёскі і гораду, абслугоўваючы нацменшасьці на іх роднай мове, дабіваючыся якасная палянізаваньня працы культурных, савецкіх, грамадзкіх і іншых арганізацый сярод нацыянальных меншасьцяй.

Праз арганізацыю беднаты і лепшую пастаноўку работы з ёй, узмацненьне блёку з серадняком, рашучую барацьбу з контр - рэвалюцыйным клерыкалізмам, які зьяўляецца агэнтурай замежнага фашызму, узмацняючы барацьбу з правямі антысэмітызму і шавінізму розных колераў, выхоўваючы батрацка-бядняцкія і серадняцкія масы ў інтэрнацыянальным духу, — пленум прапануе АК і РК узмацніць тэмп беларусізацыі партыйных, прафэсыянальных, каапэрацыйных і іншых арганізацый, дабіваючыся шырокага распаўсюджаньня беларускай мовы і культуры сярод рабочых мас і праз аўладаньне ёю паўнага кіраўніцтва культурай, як адным з важнейшых сродкаў узмацненьня кіраўніцтва бядняцка - серадняцкімі масамі вёскі з боку рабочае клясы.

У цэнтры ўвагі партыйнай арганізацыі і надалей павінна быць узмацненьне баяздольнасьці часьцей Чырвонай армії, выхоўваючы чырвонаармейцаў у духу самаахвярнай адданасьці справе пралетарскай рэвалюцыі, яшчэ большай увагі палянізаваньню быту чырвонаармейцаў і начальніцкага складу, усямернага палянізаваньня сутаварыства паміж рабочымі і Чырвонай арміяй і ўмацаваньня пралетарскага ўплыву на чырвонаармейскія масы. Пры камплектаваньні Чырвонай арміі прыняць меры да недапушчэньня сацыяльна « чужых элемэнтаў у РСЧА.

Складанасьць і ўсё больш абвастраная міжнародная абстаноўка ставяць задачу яшчэ большага ўзмацненьня работы па ваяннізацыі насельніцтва, разгортваньня работы ячэек Асоавіяхіму і Чырвонага Крыжу, падрыхтоўкі да баявой гатоўнасьці ўсяго працоўнага насельніцтва абаранцаць краіну.

Характэрнай асаблівасьцю ў дзейнасьці камсамольскай арганізацыі за мінулы пэрыяд зьяўляецца павялічэньне яе ўдзелу ў гаспадарчым і палітычным жыцьці краіны, на аснове больш рашучага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі. Аднак, дасягненьні ў працы камсамолу не заўсёды пасьпявалі за ходам сацыялістычнага будаўніцтва. Зьявіўшыся ініцыятарам сацспаборніцтва і ўдарнага руху, камсамольская арганізацыя ня здолела ўтрымаць свайго месца ў гэтым руху ў сувязі з яго разгортваньнем.

Камсамол ня прымае належнага ўдзелу ў рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

У правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі некаторыя камсамольскія арганізацыі выявілі сваю нездольнасьць стаяць на чале сучаснага этапу калгаснага руху, выпраўляць антысярадняцкія памылкі.

Аднэй з прычын недахопаў у працы камсамолу зьяўляецца ня зусім здавальняючая якасьць кіраўніцтва, засьмечанасьць радоў камсамолу сацыяльна - ідэалёгічна - чужымі элемэнтамі і непрыстасаваньне форм і мэтадаў работы да ўмоў рэканструкцыйнага пэрыяду.

Парткіраўніцтва камсамолам у значнай частцы не адпавядае запатрабаваньням работы камсамолу і ў радзе месц заводіцца да фармальных адносін.

Пленум зварачае ўвагу бюро АК на ўзмацненьне парткіраўніцтва камсамолам, палянішэньне складу кіруючых кадраў камсамольскай арганізацыі, большае

Падводзім вынікі самаправеркі

Прычыны прарыву на „Энэргіі“

Рабочая маса ня была мабілізавана на барацьбу за прамфінплян

УДАРНЫ РУХ ЗЬНІЗУ НЕ СПАТКАЎ ВОДГУКУ ЗЬВЕРХУ

ПЛЯН ДА ВАРШТАТАЎ НЕ ДАВЕДЗЕН

За выключэньнем вагавага цэху, які выканаў прамфінплян за 7 месяцаў на 101,66 проц., ні адзін цэх заводу за гэты час сваіх вытворчых праграм ня выканаў. Ліцейны недавыканаў праграмы на 3,08 проц., мэханічны і кацёльны — на 5,30 проц., а разам па заводзе вытворчая праграма недавыканана на 3,77 проц. Сабекошт прадукцыі за 6 месяцаў зьніжан замест 16,7 проц. толькі на 12,12 проц.

Асноўнымі прычынамі прарыву зьяўляюцца: адсутнасьць мабілізацыі шырокіх рабочых мас вакол задач выкананьня прамфінпляну, недавядзеньне прамфінпляну да цэхаў і варштатаў. Толькі ў сьнежні адміністрацыя накіравала прамфінплян для прапрацоўкі ў цэхі. Таму зусім ня дзіўна, што аб прарыве ў першым квартале (недавыкананьне праграмы на 13,06 проц.) рабочыя даведаліся толькі ў канцы студзеня.

САЦСПАБОРНІЦТВА — ПА ВОЛІ ХВАЛЬ

Аб дрэнным становішчы сацспаборніцтва і ўдарніцтва выразна сьведчаць наступныя лічбы. З ліку 1.100 рабочых ахоплена ўдарнымі брыгадамі ўсяго 338 чалавек. З іх членаў КП(б)Б — 68, камсамольцаў — 81. Зусім не праведзены 24, а рэшта знаходзіцца ў стадыі выкананьня. Але прапановы рабочых праводзіліся ў жыцьцё в вялікім спазьненьнем, і аб выніках сваіх прапаноў рабочыя ня ведаюць. Вось асноўная прычына — чаму рабочыя «Энэргіі» пачалі менш цікавіцца работай вытворчых нарад.

Становішча а вынаходзтвам на заводзе вельмі дрэннае. Да гэтага часу няма яшчэ бюро рацыяналізацыі. Заводакіраўніцтва вынаходзтвам ня цікавіцца. Аб гэтым сьведчыць выкрытая гэтымі днямі справа вынаходцы тав. Лапіда, справа тэхніка Айзмана, які вынайшоў прыладу для маляваньня вагі. З 5.000 руб., якія прызначаны для прэміяваньня лепшых прапаноў, за першае паўгодзьдзе скарыстана толькі 50 руб.

Лепшыя ўдарнікі — камсамольцы рамонтных майстэрняў службы цягі ст. Ворша—т. т. ЛЮБЕЦКІ, ПАЛЯКОЎ і СТАНУЛІС.

ЯК ВЫКОНВАЮЦЦА РАБОЧЫЯ ПРАПАНОВЫ

Усяго па заводзе за першае паўгодзьдзе праведзены 33 пасяджэньні вытворчай камісіі і нарады. Было ўнесена 128 рабочых прапаноў. З іх праведзена ў жыцьцё 81. Зусім не праведзены 24, а рэшта знаходзіцца ў стадыі выкананьня. Але прапановы рабочых праводзіліся ў жыцьцё в вялікім спазьненьнем, і аб выніках сваіх прапаноў рабочыя ня ведаюць. Вось асноўная прычына — чаму рабочыя «Энэргіі» пачалі менш цікавіцца работай вытворчых нарад.

Становішча а вынаходзтвам на заводзе вельмі дрэннае. Да гэтага часу няма яшчэ бюро рацыяналізацыі. Заводакіраўніцтва вынаходзтвам ня цікавіцца. Аб гэтым сьведчыць выкрытая гэтымі днямі справа вынаходцы тав. Лапіда, справа тэхніка Айзмана, які вынайшоў прыладу для маляваньня вагі. З 5.000 руб., якія прызначаны для прэміяваньня лепшых прапаноў, за першае паўгодзьдзе скарыстана толькі 50 руб.

БЯСПЛЯНАВАСЬЦЬ, БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦЬ

Самаправерка выявіла шмат фактаў бясплянавасьці і безгаспадарчасьці. Характэрным прыкладам бясплянавасьці можа служыць ліцейны цэх, які быў загружан у першым і другім квартале выключна будным ліцьцём, а ў красавіку выключна дробным. З гэтай прычыны праграма была не загружана і праграма недавыкананa на 49 %.

Заводакіраўніцтва не зварачае належнае ўвагі на барацьбу са стратамі. Па ўсім заводзе можна бачыць груды жалеза, сталі, заклёпак, балтоў і г. д., якія валяюцца пад адкрытым небам і іржавеюць.

Таксама не вядзецца барацьбы з бракам. Па мэханічным цэху брак за 5 месяцаў прынёс страт 2.216 руб. Але больш за ўсё браку ў ліцейным цэху — 8 проц.

НЯМА ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ

Сыстэматычнай падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы не праводзілася. Старыя рабочыя, замест таго, каб вучыць малакваліфікаваных, займаліся рвацтвам. Так, загадчык цэхам Татаржыцкі і токар Радзівіловіч адмовіліся вучыць малакваліфікаваных рабочых без асобнай аплаты.

ПРАЦДЫСЦЫПЛІНА КУЛЬГАЕ

Вельмі дрэннае становішча з прагуламі і спазьненьнямі на работу. За першае паўгодзьдзе прагулы складаюць 1,56%, а спазьненьні—1,23 проц., а красавік у ліцейным цэху даў яшчэ 36 прагулаў.

Вялікая цікучасьць з рабочай сілай таксама мела свой уплыў на выкананьне прамфінпляну. Так, за першае паўгодзьдзе прынята на завод 679 рабочых і звольнена 403 рабочых.

***

Часовая кантрольная камісія ўнесла рад прапаноў для паляпшэньня работы цэхаў. Гэтыя прапановы павінны быць абгавораны на пашыраных рабочых сходах з тым, каб мабілізаваць актыўнасьць усёй заводскай грамадзкасьці на зьніжэньне прарываў, якія маюць месца на заводзе.

Брыгада «Зьвязды»: БРАЙНІН, ЗЕВІН, ПАЛІЧАНСКІ.

УЗДЫМ НЕ ЗАМАЦАВАНЫ

Як працуе ўдарны менскі хлебазавод

Рабочыя менскага хлебазаводу ў пачатку сацспаборніцтва горача ўзяліся за работу. Прадукцыйнасьць працы ўзрасла. Вытворчыя нарады працавалі добра. Рабочыя добраахвотна павялічвалі нормы выпрацоўкі без павялічэньня варатоўнай платы. Нарэшце, завод абвясьціў сябе ўдарным і, сапраўды, спачатку [illegible] ударна[illegible] [illegible] арганізацыі, [illegible]

Але паступова заводзкія арганізацыі аслабілі сваю ўвагу да сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Яны супакоіліся на посьпехах, супакоіліся на тым, што завод быў абвешчан ударным, не падумаўшы, што ўздым энтузіязму і ініцыятывы рабочых трэба абавязкова замацаваць.

Першая памылка заводзкіх арганізацый была тая, што сацдагавары паміж ударнымі брыгадамі і цэхамі ня былі адразу-ж аформлены і частка дагаварoў не аформлена і да гэтага дня. Ня ўсе рабочыя былі ахоплены сацдагаварамі. Гэта прывяло да таго, што некаторыя ўдарнікі хутка забылі аб сваіх абавязках.

Другая памылка заводзкіх арганізацый, што яны не завастрылі ўвагі рабочых на выкананьне ўсіх паказальнікаў прамфінпляну, асабліва якасных паказальнікаў. Ня была завострана ўвага рабочых на якасьці прадукцыі. Таму ў пагоні за колькасьцю значна была пагоршана якасьць прадукцыі. Толькі пратэсты рабочых у друку дапамаглі таму, што якасьць хлеба зараз некалькі палепшылася.

Паступова аслаблялася працдысцыпліна. Пачалі расьці прагулы: у кастрычніку — ні аднаго, у лістападзе і сьнежні—13, у студзені — 4, у сакавіку — 6 і столькі-ж у красавіку.

Праўда, вытворчая праграма за першае паўгодзьдзе заводам перавыкананa: у першым квартале — на 4,25 цэнтнэраў, а ў другім квартале — на 2,47 цэнт. Затое ўзрасьлі страты ад браку: калі ў першым квартале завод меў страты ад браку на 123 руб., замест 100 руб., прадугледжаных планам, то ў другім квартале завод пацярпеў страт ад браку — 544 руб., замест 200 руб., прадугледжаных плянам. Сабекошт прадукцыі пакуль што вышэйшы на 1-2 кап. на клгр., чым на іншых хлебазаводах, якія працуюць у горшых умовах.

Асноўны паказальнік для хлебазаводу — якасьць хлеба — да гэтага часу цалкам ня выконваецца. Якасьць хлеба за апошні час палепшылася, але ня зусім. Яшчэ наглядаецца імкненьне ў часткі рабочых за кошт якасьці дабіцца колькаснага выкананьня плянавага заданьня.

Як і заводзкія арганізацыі, адміністрацыя значна аслабіла сваю ўвагу да работы прадпрыемства. Можна сказаць, што за ўвесь час адміністрацыя стаяла ў баку ад сацспаборніцтва і цяпер стаіць у баку. Прапановы рабочых адміністрацыяй ухваляюцца, але ня выконваюцца. Арганізацыйных неладоў на заводзе яшчэ многа. Дырэктыва партыі аб адзіначальні не ажыцьцяўляецца.

Кантроль і кіраўніцтва майстроў на вытворчасьці вельмі слабыя. Майстры, напрыклад, ня любяць самакрытыкі. Калі нядаўна на сходзе выступіў вылучэнец і абвінаваціў майстра Петрашкевіча ў нядбайнасьці, Петрашкевіч выступіў супроць вылучэнца з лаянкай і пагрозамі. Паміж сабою майстры ня дружны, стараюцца адзін аднаму нашкодзіць. Што датычыць дырэктара заводу, дык ён вельмі рэдка заглядае ў цэхі.

Арганізацыйныя неклады цягнуць за сабою прастоі. За 11 месяцаў на высокавачных печах прастоі дасягаюць 344 гадз. Прычыны розныя: часта не хапае энэргіі і аб гэтым няма каму паклапаціцца. Часта з прычыны дробнага псаваньня машыны стаіць увесь завод. 1 пакуль ня знойдзеш старшага мэханіка, які жыве далёка за горадам, рабочыя стаяць. Быў выпадак, калі бараначны цэх стаяў 2 гадз, таму, што адміністрацыя не паклапацілася назапасіць дрожджаў.

Калі завод у бліжэйшы час карэнным чынам не палепшыць сваёй работы, можа быць пастаўлена пытаньне аб пазбаўленьні заводу ганаровай назвы — ударнага.

Д.

Перавыбары ФЗМК--баявая палітычная кампанія

Усім партыйным арганізацыям КП(б)Б

ЛІСТ ЦК КП(б)Б

На падставе пастановы Бюро ЦК і фракцыі ЦСПСБ з 1-га мая пачаліся перавыбары ФЗМК. У пачатку праводзяцца перавыбары ФЗМК тых саюзаў, якія зьвязаны з сезоннымі работамі (будаўнікі, гарнякі, воднікі і г. д.). Па ўсіх іншых саюзах перавыбары ФЗМК праводзяцца ў асноўным у чэрвені і ліпені м-цы.

ЦК КП(б)Б зварачае ўвагу ўсіх парт. арганізацый на тое, што перавыбары ФЗМК павінны прайсьці, як баявая палітычная кампанія вялікай важнасьці, якая павінна на бліжэйшы час стаць у цэнтры ўвагі ўсіх парт. арганізацый, асабліва на прадпрыемствах і да якой неабходна прыцягнуць самыя шырокія масы рабочых і членаў прафсаюзаў.

Асноўны лёзунг, пад якім павінны прайсьці перавыбары ФЗМК, павінен быць — мабілізацыя самых шырокіх мас рабочых на выкананьне і перавыкананьне прамфінплянаў, як неабходнай умовы, забясьпечваючай выкананьне 5-цігодкі за чатыры гады, і праверка работы ФЗМК у гэтым напрамку, асабліва ў галіне кіраўніцтва ўдарніцкім рухам і барацьбы з ілжэ - ўдарніцтвам, давядзеньня прамфінпляну да цэху, варштату, укараненьня і правядзеньня адзіначальля на прадпрыемствах, барацьбы за зьніжэньне сабекошту і паляпшэньне якасьці прадукцыі і г. д.

Парт. арганізацыям неабходна дабіцца ўвязкі канкрэтных задач выкананьня вытворчых заданьняў з агульнымі задачамі рабочае клясы, асабліва на задачах барацьбы з права - апартуністычным ухілам ад парт. лініі, як найбольш небясьпечным на даным этапе, не паслабляючы адначасова з гэтым барацьбы з «левымі» загібамі ад лініі партыі, асабліва завастраючы ўвагу шырокіх мас рабочых і членаў прафсаюзаў на неабходнасьці рашучай барацьбы з праяўленьнямі ўхілаў ад парт. лініі ў праф. рабоце.

У справе перабудовы працы прафсаюзаў, пераводу іх на новыя формы і мэтады работы і рашучага павароту іх тварам да вытворчасьці павінен быць дасягнут у часе перавыбараў рашучы пералом. Усю працу прафсаюзаў, усе галіны прафработы, усе органы прафсаюзаў з нізу да верху,—неабходна паставіць пад жорсткі абстрэл масавай пралетарскай самакрытыкі, перабудоўваючы ўсю працу прафсаюзаў на базе самакрытыкі, вызваляючы ўсе органы прафсаюзаў ад нездольных, ня ўмеючых весьці рашучую барацьбу за Ленінскую генэральную лінію партыі і сапраўды працаваць па-ўдарнаму. Неабходна ўсямерна ўзмацніць парт. кіраўніцтва ўсёй працай прафсаюзаў, канкрэтызаваць гэтае кіраўніцтва, цягнуць усіх камуністых і камсамольцаў у актыўны ўдзел ва ўсе галіны праф. работы, асабліва ў працу па падрыхтоўцы і правядзеньні перавыбараў ФЗМК.

Перавыбары ФЗМК неабходна правесьці пры шырокім разгортваньні прафсаюзнай дэмакратыі і скарыстаць для шырокага прыцягненьня рабочых - ударнікаў у якасьці добраахвотнікаў да ўсёй праф. працы для больш рашучага вылучэньня на адказную кіруючую праф. працу лепшых рабочых і работніц - ударнікаў і для павялічэньня колькасьці беспартыйных рабочых, работніц і моладзі ў складзе ФЗМК і асабліва сярод вызваленых кіруючых праф. працаўнікоў.

Парт. ячэйкам і калектывам, РК і АК КП(б)Б зараз-жа па сканчэньні працы па перавыбарах падагуліць усю гэту працу, ацэньваючы яе па ступені дасягнутых посьпехаў у галіне выкананьня і перавыкананьня прамфінплянаў і забясьпечыць кіраўніцтва гэтай працай і выпраўленьне недахопаў на хаду перавыбараў.

Фракцыі ЦСПСБ і ЦП саюзаў забясьпечыць жывое штодзённае кіраўніцтва ўсім ходам перавыбараў, вылучыўшы ўсіх кіруючых працаўнікоў для гэтай працы, забясьпечыўшы дапамогу больш слабым саюзам і арганізуючы сац. спаборніцтва на лепшае правядзеньне перавыбараў.

Калі Белдзяржбуд выканае абавязацельствы

У чэрвені 1929 г. дырэкцыяй выстаўкі быў заключан з Белдзяржбудам дагавор на пабудову 1-ай усебеларускай выстаўкі сельскае гаспадаркі і прамысловасьці. Згодна дагавору, усе работы Белдзяржбуд выконвае сваімі рабочымі і добрай якасьці, тэхнічным пэрсаналам, сваімі інструмантамі, транспартамі і матар'яламі. Белдзяржбуд абавязаўся ўсе работы на-чорна выканаць да 1 лютага 1930 г., а з знадворнай і ўнутранай афарбоўкай поўнасьцю будынкі здаць дырэкцыі не пазьней 1 чэрвеня.

Белдзяржбуд абавязаўся ў тэрміновым парадку распрацаваць праекты і прыступіць да будаўніцтва павільёнаў, вызначаных на генэральным пляне дыпастаянных і часовых павільёнаў. Як геалтоўную нядбайнасьць і безгаспадарчасьць трэба адначыць, што павільёны аддзелу жывёлагадоўлі былі пабудаваны яшчэ з восені мінулага году і дагэтуль гэтыя павільёны стаяць з ненакрытымі стрэхамі.

Зараз пачалі пастукаць экспапаты в акруг і раёнаў на выстаўку. Учора атрымана в Масквы павільёнаў, што імпартнае абсталяваньне для мэханізованых павільёнаў, якое было-б спазвана за межамі Беларусі — у Швэцыі, Нямеччыне і Амэрыцы — пачнае таксама прыбываць праз Ленінградзкі порт. Трэба даць дэкаративнае тэрыторыі выстаўкі, трэба праводзіць электраасьвятленьне, трэба забясьпечыць вадою павільёны з жывымі экспанатамі, унутранае абсталяваньне павільёнаў, разьмяшчэньне экспанатаў і паогул поўную арганізацыю выстаўкі з унутраным і знадворным мастацтвам і афармленьнем.

Адначасова дырэкцыя і ў красавіку месяцы зноў пачалася перабой з матар'яламі, зноў пачалася напоўная нагрузка рабочых, у выніку чаго ўсяго гэтага па сёнешні дзень на выстаўцы з 42 будынкаў няма ніводнага поўнасьцю пабудаванага і скончанага павільёну. Цяпер новая бяда — няма толю і жалеза. Белдзяржбуд свячасова не паклапаціўся аб тым, каб заказы на выстаўку дахавае жалеза і толь для пакрыцьця



На пабудове выстаўкі. Павільён прамысловасьці.

рэкцыяй. Прэзыдыумам ВСНГ была дана дырэктыва — будаваць выстаўку ў нечарговым парадку, паколькі выстаўка мае вялізарнае палітычнае і эканамічнае значэньне і павінна быць адкрыта строга ў вызначаны тэрмін — 10 жніўня 1930 г.

Само сабою зразумела, што добры будаўнік, добры гаспадар павінен у першую чаргу забясьпечыць сябе неабходнымі будаўнічымі матар'яламі. Гэта было тым лягчэй, што будаўніцтва выстаўкі зьяўляецца амаль што выключна драўляным, з невялікай колькасьцю цэглы і жалеза і можна было лёгка ляснымі матар'ял даставіць на тэрыторыю выстаўкі яшчэ ў мінулым годзе.

Гэта рэч настолькі вядомая і зразумелая, што тут ня трэба было быць вялікім спэцыялістам, а трэба было належным чынам і з належнай увагай адносіцца да гэтага будаўніцтва. Але Белдзяржбуд прыступіў да будаўніцтва без належнага запасу будаўнічых матар'ялаў, якія даставляліся на выстаўку «праз гадзіну па ложцы». І таму ўвесь час на працягу 10-ці месяцаў на выстаўцы адчуваецца недахват драўляных матар'ялаў. Гэта ў Беларусі, у лясістай краіне, дзе асноўным багацьцем зьяўляецца лес і якім Беларусь забясьпечвае будаўніцтва іншых рэспублік, як напрыклад, Украіну і г. д.

Для таго, каб спыніць гэту безгаспадарчасьць і нядбайнасьць, дапушчаныя Белдзяржбудам, для таго, каб спыніць усялякія гутаркі з дня ў дзень аб тым, што будаўніцтва выстаўкі затрымліваецца з прычыны нястачы драўніны і інш., СНК і дырэкцыя выстаўкі былі прынялі рашучыя меры, каб задаволіць поўнасьцю будаўніцтва выстаўкі матар'ялам (ня гледзячы на тое, што Белдзяржбуд абавязаўся ўсе работы выканаць сваімі матар'ялам належнай колькасьці і якасьці) была падана заяўка Наркамгандлю БССР на водпуск лесаматар'ялу, патрэбных для поўнага сканчэньня работ і, апрача таго, Саюзлесам таксама праведзен дадатковы водпуск лесаматар'ялу па заяўках дырэкцыі выстаўкі. СНК і ВСНГ былі прынялі і іншыя меры. Спэцыяльна працагаў для патрэб выстаўкі завод «Дрэваапрацоўшчык» на працягу 14 дзён, былі здабыты фонды розных дэфіцытных матар'ялаў.

Ня гледзячы на ўсё гэта, будаўнічыя работы на выстаўцы ішлі вельмі павольна і толькі ў сакавіку месяцы Белдзяржбуд пасьля зробленага націску некалькі разгарнуў работу — павялічылася ў два разы колькасьць рабочых-будаўнікоў, узмоцнены тэмп дастаўкі на выстаўку будаўнічых матар'ялаў. Такім чынам, па ходзе будаўніцтва, якое было ў сакавіку месяцы, можна было-б спадзявацца, што будаўніцтва будзе скончана ў вызначаны тэрмін — 15 мая.

Але гэта цягнулася недоўга і ў красавіку месяцы зноў пачалася перабой з матар'яламі, зноў пачалася напоўная нагрузка рабочых, у выніку чаго ўсяго гэтага па сёнешні дзень на выстаўцы з 42 будынкаў няма ніводнага поўнасьцю пабудаванага і скончанага павільёну. Цяпер новая бяда — няма толю і жалеза. Белдзяржбуд свячасова не паклапаціўся аб тым, каб заказы на выстаўку дахавае жалеза і толь для пакрыцьця

Становішча з кантрактацыяй ярыны ў БССР пагражаючае

ПЕРШАЯ ДЭКАДА МАЯ ДАЛА ЗЬНІЖЭНЬНЕ ЗАКАНТРАКТАВАНЫХ ПЛОШЧАЎ

ЗРУХУ НЯМА

Здавалася-б, што пасьля раду дырэктыў партыйных і савецкіх органаў, пасьля шматлікіх выездаў кіруючых працаўнікоў на месца, — у працы па кантрактацыі павінен быў наступіць пэўны зрух. Агульнавядома, што для кантрактоўшчыкаў і часоўшчыкаў тэхнічных культур быў устаноўлен рад ільгот. Ня гледзячы на ўсё гэта, першая дэкада мая ў сярэднім па БССР дае не павялічэньне, а наадварот—зьніжэньне закантрактаваных плошчаў. Калі на 1 мая плянавае заданьне па кантрактацыі было выканана на 33 проц., дык на 10 мая яно складае толькі 31,5 проц. — зьніжэньне на 1,5 проц. Асабліва дрэнна па Магілеўскай, Віцебскай і Аршанскай акругах.

Да кантрактацыі сена прыступіла толькі Полацкая округа і то зрабіла вельмі мала — закантрактавала ўсяго 177 гэкт. Астатнія округі да гэтай важнай у нашых умовах працы, зусім не прыступілі. Гэта можна вытлумачыць выключна нядбайнымі, зусім недапушчальнымі адносінамі да такой сур'ёзнай справы.

Па ільну-валакне і семі выкананьне пляну на 10 мая складае 29,4 проц. замест 32 проц. на 1 мая. Зьніжэньне ідзе за кошт Мазырскай, Аршанскай і Полацкай округ. Магілеўская округа дае павялічэньне ўсяго на 1 проц. — выканала плян усяго на 11 проц. Гэтыя лічбы яскрава адбіваюць настрой Магілеўскай агранаміі і каапэрацыйных работнікаў, што ў Магілеўшчыне ўкараняць лён немагчыма. Віцебская округа, якой даны найлепшыя ўмовы для кантрактацыі ільну, дае павялічэньне кантрактацыі па ільне ўсяго на 5 проц. — выканала плян на 27 проц.

З кантрактацыяй іншых культур становішча аналёгічнае ільну. За мінулую дэкаду [illegible] культур дае з[illegible] [illegible]канюшыне [illegible], за выключэньнем бульбы [illegible] дае павялічэньне толькі на 1 проц.

З кантрактацыяй махоркі становішча зусім катастрафічнае, асабліва таму, што сяўба яе ўжо канчаецца. На 1 мая лічбы месц гаварылі аб выкананьні пляну на 64 проц., а на 10 мая плян выканаць толькі на 52 проц. Зьніжэньне ідзе выключна за кошт Магілеўскай акругі, якая на 1-е мая выканала плян на 105 проц., а на 10 мая — толькі на 58 проц.

У вогуле, мы маем зьніжэньне кантрактацыі па ўсіх культурах у абагуленым сэктары і зусім незначнае павялічэньне па індывідуальным сэктары. Так, па жыце азімым калгасы выканалі 50,3 проц. пляну кантрактацыі, індывідуальны сэктар — 49,7 проц.; па ярыне: калгасы — 71,2 проц., індывідуальны сэктар — 28,8 проц.; па ільну-валакне, семі і каапэрацыях: калгасы — 68 проц., індывідуальны сэктар — 32 проц.; па канюшыне: калгасы — 82,5 проц.; індывідуальны сэктар — 17,5 проц.; па бульбе: калгасы — 75,4 проц., індывідуальны сэктар — 24,6 проц.

Гэтыя лічбы красамоўна кажуць, што кантрактуючыя арганізацыі ўсё яшчэ не ўдзяляюць належнай увагі абслугоўваньню індывідуальнага сэктару. У некаторых округах гэта выяўляецца ў зусім недапушчальнай і злачынай форме. Прыкладам можа служыць Магілеўская округа. Яна павінна закантрактаваць 20.000 гэкт. ільну-валакна і семя, а закантрактавала ўсяго ў індывідуальным сэктары 228 гэкт. Бульбы патрэбна было закантрактаваць 15.000 гэкт. ільну, а закантрактавала ў індывідуальным сэктары ўсяго 115 гэкт. Мазыр, які павінен закантрактаваць 1.000 гэкт. ільну і 4.314 гэкт. бульбы, у індывідуальным сэктары закантрактаваў ўсяго 5 гэкт. ільну і 53 гэкт. бульбы.

Усё гэта гаворыць аб надзвычай дрэнным ходзе кантрактацыі, аб тым, што пастановы ўраду і партыі па пытаньнях кантрактацыі па выконваюцца. Асноўныя прычыны гэтыя заключаюцца ў тым, што на мясцох зварачаецца далёка недастатковая ўвага абслугоўваньню і працы з індывідуальным сэктарам. Устаноўленыя ільготы кантрактоўшчыкам і пасеўшчыкам тэхнічных культур (ільну-валакна і махоркі) не даводзяцца да сяла і двара.

Часу для кантрактацыі засталося надзвычай мала. Трэба прыняць усе меры, каб плянавыя заданьні па кантрактацыі былі выкананы поўнасьцю. Трэба шырока папулярызаваць устаноўленыя ўрадам ільготы кантрактоўшчыкамі пасеўшчыкам тэхнічных культур, якія бязумоўна забясьпечваюць пасьпяховы ход і правядзеньне вясновай пасеўнай кампаніі і кантрактацыі.

ЛАЦЬІС.

Усім старшыням акрвыканкомаў

СТАНОВІШЧА З КАНТРАКТАЦЫЯЙ ПАЛЯВОДЧЫХ КУЛЬТУР КАТАСТРАФІЧНАЕ. УВЕСЬ ЧАС ІДЗЕ ЗЬНІЖЭНЬНЕ. ПЕДАПУШЧАЛЬНА ДРЭННА КАНТРАКТУЕЦЦА ЛЕН І БУЛЬБА Ў ВІЦЕБСКАЙ, МАГІЛЕЎСКАЙ, А ТАКСАМА АРШАНСКАЙ І МАЗЫРСКАЙ АКРУГАХ. ПРАПАНУЮ ТЭРМІНОВА ПРАВЕРЫЦЬ І ПРЫНЯЦЬ МЕРЫ ДЛЯ ЗАВЕСЬПЯЧЭНЬНЯ ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ КАНТРАКТАЦЫІ, ПРЫЦЯГНУЎШЫ ВІНАВАТЫХ У ЗРЫВЕ КАНТРАКТАЦЫІ ДА АДКАЗНАСЬЦІ.

НАМСТАРШЫНІ СНК БССР БЭНЗК.

Аб аднэй „спробе аўтабіяграфіі“*)

Аб «дыскусіі супроць апазыцыі» мы зараз гаварым. Але згадзецеся самі, што напісаць усё паданае зараз месца можна было толькі ў стане вельмі вострага «натхненьня», калі з-пад «спуда» выходзяць словы, нечаканыя для прамоўцы» — або пісьменьніка. «Накацію, ягамосьцю, накацію!» — усклікнаць хлысты, калі на іх сход сходзіць «дух». На Троцкага яўна «накаціла», калі ён пісаў аб «задушэньні і разгроме бальшавіцкай партыі» ў 1923 годзе. Але што ў цьвярозага ў галаве, то ў п'янага на языку: да чаго трэба было ненавідзець гэту самую партыю, каб паказаць яе разгром справай трох чалавек. Тры чалавекі могуць зрабіць другую рэвалюцыю і «задушыць» калектыў у мільён людзей. І прытым тры чалавекі, якія дзейнічалі выключна а асабістых мадаваў супроць пэўнай асобы.

«Ідэя тройкі: Сталін, Зіноўеў, Камянеў была ўжо даўно гатова. Лязом сваім тройка была накіравана супроць мяне. Уся задача змоўшчыкаў заключалася ў тым, каб, падрыхтаваўшы выстарчальную арганізацыйную апору, карапаваць тройку ў якасьці заканчай перасмніцы Леніна» (там-жа, 223. Падкрэслена мною. М. П.).

Далей расказваецца, як адна «маленькая запісачка» Леніна ледзь-ледзь не разбурыла ўсёй камбінацыі. Пры такім ходзе гісторыі, пядома, ня тое, што заспісачкі — выпадкова перакуленай чарнілцы досыць, каб зьнішчыць дзяржаву. І гэтага чалавека дзесяцігодзьдзямі зачілі марксыстым.

Само сабою зразумела, што хваробы тых гігантаў, якія робяць сусьветную гісторыю, становяцца пры гэтым ужо зусім і бясспрэчна буйнейшымі гістарычнымі фактарамі. І вось на тым месцы, дзе ў будучых «фальсыфікатараў гісторыі» будзе стаяць апавяданьне аб барацьбе трацкісцкай фракцыі супроць партыі, у Троцкага чытач знаходзіць тры гісторыі хваробы плюс паляваньне на качак.

Так, так: я не фантазую. Што перашкодзіла зьвяржэньню «эпігонаў» (яны-ж «тройка») у 1923 годзе? Хвароба —хвароба Леніна, і толькі гэта хвароба.

«Я не сумняваюся, што калі-б я выступіў напярэдадні XII зьезду ў духу «блёку» Леніна - Троцкага супроць сталінскага бюракратызму, я-б атрымаў перамогу і бяз простага ўдзелу Леніна ў барацьбе»... «У 1922-23 годзе зусім магчыма было яшчэ аўладаць камандным пазыцыяй адкрытым нацiскам на хутка складваную фракцыю нацыянал - сацыялістычных чынноўнікаў, апаратных узурпатараў, пенаконных насьлядоўцаў Кастрыкніка, эпігонаў бальшавізму. Галоўнай перашкодай на гэтым шляху быў, аднак, стан самога Леніна». «Ва ўсіх плянах і разрахунках быў рашаючы момант неакрэсьленасьці: гэта сам Ленін са сваім фізычным станам». «Дзякуючы выключнаму месцу, якое займаў у партыі, Ленін, неакрэсьленасьць яго асабістага стану абярнулася ў неакрэсьленасьць стану ўсёй партыі» («М. ж.», т. II, стар. 219-220).

У дадатак яшчэ і самаго Троцкага «на некалькі тыдняў прыкаваў да ложку прастрэл». Так «эпігоны» і ўцалелі ў гэту крытычную для іх мінутку. Як было, здавалася, не дадумацца, што пры такіх умовах Троцкаму трэба было дакладнейшым чынам глядзець за сваім здароўем? Як было гэтага не зразумець? А ён узяў ды ў халодную восень паехаў страляць на качак.

Аб гэтым сусьветна « гістарычным здарэньні, акрэсьліўшым лёс не аднаго Савецкага Саюзу, чытач даведаецца на стар. 234—238 II тому «М. ж.» з усімі неабходнымі для такога ўрачыстага выпадку падрабязнасьцямі — з біяграфіяй паляўнічага, які кіраваў дзеяньнямі «найвышэйшага насьлядоўцы Леніна ў [illegible]

рычнымі экскурсамі (да Івана Грозна-га), з прозьвішчам шофэра, бліскасьць якога да вялікага здарэньня таксама, зразумела, зрабіла гістарычнай асобай і г. д., і г. д. Словам, калі-б хто пачаў чытаць «Мою жизнь» з гэтага месца, ня маючы выразнага ўяўленьня аб фізіяноміі ня аўтара, такі няўважлівы чытач быў-бы варты накараньня, трапіўшы ў надзвычай недарэчнае становішча; мабыць ён з абурэньнем кінуў-бы кнігу, парашпурнуў, што аўтар над ім, чытачом, проста зьдзекуецца. Чытач гэтай заметкі ведае, з кім мы маем справу, — ён ведае, што тут трэба ня крыўдзіцца і не злавацца, а разумець. Але я баюся, што нават такі падрыхтаваны чытач ня ўстрымаецца ад непаважнага заключэньня, што яму, чытачу, рэдка прыходзіцца сустракаць аўтара больш блізкага да вострага параксызму маніі вялікасьці.

Паляваньне на качак выдатна, зразумела, ня качкамі, нават паогул невядома, ці падарпелі качкі. Але пасьля паляваньня, сьпяшаючы задаволіць цікаўнасьць шофэра, «які гарэў нецярплівасьцю даведацца, якава здабыча» — як малое заўсёды пераплятаецца з вялікім! — Троцкі пабег у валенках па балоце, прамачыў ногі і прастудзіўся. «Дактары забаранілі ўставаць з пасьцелі. Так я праляжаў увесь канец восені і зіму. Гэта значыць, што я прахварэў дыскусію 1923 году супроць «трацкізму». Можна прадбачыць рэвалюцыю і вайну, але нельга прадбачыць вынікі асеньняга паляваньня на качак» (чытач, дасьняга паляваньня на качак» (чытач, маючы запас клічнікаў, можа выкарыстаць колькі трэба: у мяне ўсе выйшлі— М. П.).

«Ленін ляжаў у Горках, я — у Крамлі. Эпігоны пашыралі колы змовы». У наяўнасьці з усіх груповак, што наменаўнасьці з усіх груповак, што наменаўнасьці з усіх груповак, ня ляжаў ў рэальнай школе сб. Пачуліся яшчэ ў рэальнай школе сб. Пачуліся яшчэ ў рэальнай школе сб. Пачуліся яшчэ

Веснавая лоўля рыбы

ПАГРОЗА ЗРЫВУ МАЙСКАГА ПЛЯНУ

Цяпер рыбацкім арцелям не папулярызаваны, арцелі не пераведзены на новы статут

За ш... выканан... плян лоўлі рыбы па БССР ... на 48% — замест 4.006 ... цэнтн. ... сьпячэньня рабочага на сельніцтва ... ціла толькі 1.635 цэнтн. 3 1-га ст... 1930 г. вылаўлена 4.421 цэнтн. або... гадавога пляну.

Першая д... ніднёўка мая сігналізуе аб зрыве і ма... га пляну — больш ці рыбных акруг... Полацкая і Віцебская, у сярэдним ві... лі ў дзесяцідзёўку 19% месячнага ... ну. Астатнія акругі недалёка адыш... ад іх.

Якія ж прычы... тармозяць выкананьне пляну? Асноўнае — гэта слабая арганізацыя рыбацкага насельніцтва, якое за умовах ... Беларусі занята таксама сельскай гаспадаркай. Сампрамкаапэрацыя, на якую ... складзена работа па арганізацыі рыбацкага насельніцтва, чакае лаўлі рыбакі, таксама як саматужнікі — шаўцы і крэўцы, будуць абіваць парогі, каб арганізаваць арцелі. Сыстэма сампрамкаапэрацыі ў гэтым пытаньні ... сваёй самадзёку.

Яскравай ілюстрацыяй гэтага становішча могуць служыць атрыманыя матар'ялы з Полацкае акругі, дзе за час ад 1-га студзеня арганізавана ўсяго толькі 2 арцелі ... ды і то ня Сампрамсаюзам, а работн... камі «Белрыбы». Былі выпадкі, калі работнікі «Белрыбы» пра... Сампрамсаюз аб пасылцы інструкторо... для афармленьня арцеляй, але гэтыя інструктары да гэтага часу яшчэ ня прыбылі. Інструктар Пэсенка растлумачыў — «пр... калгасах, павінны існаваць на рыбных ... брыгады, а спэцыяльныя рыбныя арцелі», і ў выніку ён садзейнічаў разва... ў гэтых брыгад. Інструктар Скавырка ... палец аб палец ня стукнуў для падрыхтоўкі да веснавое лоўлі.

Сп... ратакі рыбакі забясьпечаны ... запалову. Калі Паляводсаюз, які ... ёднаў рыбацкія арцелі, перадаваў усе справы Сампрамсаюзу, ён заабяцаў пра адну «дробязь» — пра спэцыяльную ... Паляводсаюз у вопратку для рыбакоў. Гэта ... першую чаргу паклапаціўся аб забесьпячэньні ботамі сваіх служачых, і цяпер палова рыбакоў ходзіць разутымі.

Да ўсяго гэтага трэба дадаць, што ні Сампрамсаюз, ні работнікі «Белрыбы» на мясцох нічога не зрабілі для растлумачэньня рыбацкаму насельніцтву вызначаных для іх ільгот і для пераводу арцеляй на новы статут.

У цэлым радзе раёнаў неарганізаваныя рыбакі, не заахвочаныя да працы, з надыходам веснавой сяўбы пакідалі ... вады і пайшлі на поле.

Прыняты ЭКАНА БССР плян прадугледзіць падрыхтоўку калгаснай і саўгаснай сыстэмы плошчы агульных сажалак у разьмеры 2.200 гэкт. для засяленьня іх вясной 1931 г. пасадачным матар'ялам з гадавальнікаў «Белрыбы». Ня гледзячы на тое, што ўжо з 1-га мая трэба было прыступіць да абсталяваньня гэтае плошчы, да гэтага часу яшчэ ідуць размовы і перапіска паміж «Белрыбай» і гэтымі сыстэмамі. Сыстэмы патрабуюць ад «Белрыбы», каб яна непасрэдна абсталявала сажалкі і перадала іх гатовымі для карыстаньня, дабіваюцца нават, каб работнікі, якія будуць працаваць па гэтай галіне, аплочваліся за кошт «Белрыбы». «Белрыба»-ж замест таго, дай рашуча дзейнічаць і настойваць — бяздзейнічае і цярпліва чакае адказаў на свае шматразовыя запытаньні.

Пры такіх тэмпах выкананьня пляну мы ня будзем мець інтэнсыўнага разьвіцця рыбнай справы ў БССР. Неабходна, каб адпаведныя органы па-сур'ёзнаму заняліся высьвятленьнем усіх прычын, якія тармозяць ператварэньне рыбнай гаспадаркі БССР з аматарскае ў галіну, каторая павінна будзе запоўніць нястачу мясных прадуктаў.

З. Л.

Па Савецкай Беларусі

ЛЯСЬНІКІ НЕ ЗНАЁМЫ З ПРАВІЛАМІ ПАСАДКІ ЛЕСУ

(Чырвона-Слабодзкі раён, Бабруйшчына)

Адміністрацыя Чырвона-Слабодзкага лясьніцтва пра... вялі слабы ўдзел у пасадках ... зерава... ... ляміі. Лясьніцтвам, што выда... лах трэба рабіць ... Аб'ездчыкі і ... ёмы з правіла... На ... ...